WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

4 кастрычніка 2011 г.
АЎТОРАК
№ 189 (27053)
Кошт 750 рублёў

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Кампетэнтна

# КАСТРЫЧНІК: новае ў сацыяльнай падтрымцы насельніцтва



### НА 28% ПАВЫШАЕЦЦА ТАРЫФНАЯ СТАЎКА ПЕРШАГА РАЗРАДУ

Як патлумачыла ўчора «Звяздзе» **міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна ШЧОТКІНА**, гэтаму паспрыяла даручэнне, якое кіраўнік дзяржавы даў ураду: разгледзець і прапрацаваць — з улікам магчымасцяў бюджэту дзяржавы — пытанне аб павышэнні тарыфнай стаўкі першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы да канца гэтага года. У мэтах выканання даручэння ўрадам была прынята пастанова ад 1 кастрычніка 2011 года № 1310, згодна з якой з 1 кастрычніка гэтага года тарыфная стаўка першага разраду павышана са 118 да 151 тысячы рублёў (на 28 працэнтаў).

Акрамя таго, улічваючы няпростую сітуацыю, якая склалася ў эканоміцы рэспублікі, гэтай жа пастановай з 1 лістапада 2011 года **для аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы ўведзены штомесячныя дыферэнцыраваныя даплаты ў дыяпазоне 240-16 тыс. руб.** Канкрэтныя памеры названых даплат па тарыфных разрадах (з 1-га па 27-ы) у бліжэйшы час будуць устаноўлены пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Як адзначыла Мар'яна Акіндзінаўна, павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду дазваляе, па-першае, палепшыць структуру заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы за кошт уключэння індэксацыйных выплат часткова ў памер тарыфнай стаўкі першага разраду, а часткова — у штомесячныя дыферэнцыраваныя даплаты. Так, у жніўні 2011 года памер індэксацыі, якая выплачвалася кожнаму работніку бюджэтнай сферы, склаў 243,7 тыс. руб., што больш чым у 2 разы вышэй за памер дзеючай тарыфнай стаўкі першага разраду (118 тыс. руб.). Па-другое, умацаваць тарыфную частку заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы, павысіўшы іх тарыфныя стаўкі (аклады) на 28 працэнтаў. Па-трэцяе, павялічыць суму сродкаў, якія накіроўваюцца на стымулюючыя выплаты (прэміі, надбаўкі), што дасць магчымасць наймальніку ў павышаных памерах стымуляваць працу найбольш кваліфікаваных, ініцыятыўных работнікаў. І апроч таго — павысіць шэраг выплат стымулюючага і кампенсуючага характару, якія вылічаюцца ад тарыфнай стаўкі першага разраду (напрыклад, даплаты маладым лекарам, настаўнікам, трэнерам-выкладчыкам па спорце; даплаты вучоным за вучоныя ступені і званні; павышэнні асобным катэгорыям работнікаў аховы здароўя, адукацыі, культуры, спорту; даплаты за працу ў шкодных умовах працы і іншыя).

— Не варта забываць і пра арганізацыі рэальнага сектара эканомікі, асобныя з якіх у сваіх лакальных нарматыўных прававых актах прадугледжваюць устанаўленне тарыфнай стаўкі першага разраду на ўзроўні не ніжэй, чым устаноўлены ўрадам, — дадала міністр.

### ДАПАМОГІ Ў СУВЯЗІ З НАРАДЖЭННЕМ ДЗІЦЯЦІ З 1 КАСТРЫЧНІКА ЎЗРАСЛІ ЎДВАЯ

... што прадугледжана ўказам № 416 ад 15 верасня гэтага года. Днём узнікнення права на такую дапамогу з'яўляецца дзень нараджэння дзіцяці, адзначыла Мар'яна Шчоткіна. Па яе словах, у выпадку нараджэння дзяцей да 30 верасня ўключна дзяржаўная дапамога прызначаецца ў наступных памерах: пры нараджэнні першага дзіцяці — 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму (2 млн 211 тыс. 800 рублёў), пры нараджэнні другога і наступнага дзяцей — 7 бюджэтаў пражытковага мінімуму (3 млн 96 тыс. 520 рублёў). Калі ў сям'і чакаюцца першынцы, то пры нараджэнні двайнят памер дапамогі вызначаецца дыферэнцыравана: на першага з дваіх выплачваецца 5 БПМ, на другога — 7 БПМ. Калі ў сям'і ўжо ёсць дзеці, то дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці будзе выплачана ў памеры 7 БПМ на кожнага з народжаных.

На дзяцей, народжаных з 1 кастрычніка, дапамога будзе выплачвацца ў наступных памерах: пры нараджэнні першага дзіцяці — 10 БПМ перад датай нараджэння дзіцяці (да 31 кастрычніка ўключна — 4 млн 423 тыс. 600 руб.), пры нараджэнні другога і наступнага дзяцей — 14 БПМ (да 31 кастрычніка ўключна — 6 млн 193 тыс. 40 руб). Акрамя таго, пры нараджэнні двайнят дадаткова прадугледжана аднаразовая выплата на набыццё дзіцячых рэчаў першай неабходнасці на кожнага з дзяцей у памеры двухразовай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (да 31 кастрычніка ўключна — 884 тыс. 720 руб). Выплата гэтай дапамогі вызначаецца ў органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

Міністр нагадала, што зараз бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва складае 442 тыс. 360 рублёў, а з 1 лістапада гэтага года ён будзе перагледжаны.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

ВПЕРВЫЕ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ!

**Академия управления при Президенте Республики Беларусь**

ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР ПО ПРОГРАММЕ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ II СТУПЕНИ С УГЛУБЛЕННОЙ ПОДГОТОВКОЙ СПЕЦИАЛИСТА, С ПРИСВОЕНИЕМ СТЕПЕНИ – МАГИСТР УПРАВЛЕНИЯ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТИ

**«Управление инвестиционными проектами в государственно-частном партнерстве».**

**Государственно-частное партнерство** – это сотрудничество государства и частного бизнеса с целью реализации проектов в области инфраструктуры, оказания общественных услуг и инновационного развития.

**Что является сферой бизнес-модели государственно-частного партнерства?**

- Безопасность и правопорядок
- Здравоохранение
- Инновации
- Строительство
- Транспорт
- Архитектура
- и другие сферы

**Цель государственно-частного партнерства** – привлечение частного капитала в развитие инфраструктуры и повышения качества услуг, в создание инновационной экономики.

**Суть государственно-частного партнерства** заключается в перераспределении ответственности и рисков для развития секторов, которые относятся к сфере ответственности государства – инфраструктура, наука и инновации.

**Цель государства в бизнес-модели государственно-частного партнерства:** повысить эффективность системы предоставления услуг и их качества.

**Как обеспечить достижение этой цели?** Государство привлекает квалифицированного менеджера-частного партнера на условиях конкурса.

**Государство и частный бизнес** несут равную ответственность друг перед другом, обществом и потребителем.

**Выгоды для частного бизнеса:** долгосрочная стабильная и прибыльная ниша для бизнеса.

**Приглашаются специалисты и руководители государственных организаций и частного бизнеса.**

**Форма обучения** – заочная.
**Срок обучения** – 1 год 6 месяцев.
**Прием документов** – с 4 октября по 17 октября 2011 г.
**Конт. тел.** 8 (017) 222 83 48

*Подробная информация находится на сайте Академии управления при Президенте Республики Беларусь **www.pac.by** (вкладка «студенту магистратуры»).*

Ліст у нумар

## ШЛЯХ ДА МОВЫ

**ДЛЯ чалавека, як прадстаўніка віду homo sapiens, важным і неабходным з'яўляецца мова. Для чалавека, як істоты біялагічнай, — прадаўжэнне роду. Для чалавека ў гістарычным кантэксце — Радзіма.**

Радзіма. Дзеці. Мова.

Я не памылюся, калі скажу, што ў наш час не тое, што беларускамоўнае дзіця, а свядомы чалавек, які ў штодзённым жыцці размаўляе па-беларуску, — рэдкасць. У вёсках ды невялічкіх пасёлках віруе трасянка, а ў гарадах шчыльна засела руская мова...

Дзе месца беларускай мовы? У падручніках па літаратуры? Ці сярод «абраных» пластоў насельніцтва?

СТАР. 4

# Дыферэнцыраваная аплата за ваду: ЛІЧЫМ І ЭКАНОМІМ

**Як вядома, у нашай краіне з 1 кастрычніка ўведзена дыферэнцыраваная аплата за ваду. Калі вы расходуеце 140 літраў у суткі, плаціць будзеце па старых цэнах. За ўсё, што звыш гэтага паказчыка, — па тарыфах, якія забяспечваюць поўную кампенсацыю эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне.**

### Дык колькі спажываць?

Зараз давайце палічым: калі перавесці 140 л у кубаметры (менавіта ў іх фіксуюць расход вады індывідуальныя лічыльнікі, устаноўленыя ў пераважнай большасці беларускіх кватэр), то гэта складзе 0,14 кубічнага метра. Памнажаем на колькасць дзён у месяцы — атрымліваем 4,2 кубаметра. Менавіта столькі вады павінен расходаваць адзін чалавек, каб плаціць па ранейшым тарыфе — 890 рублёў за 1 куб. метр. Усё, што звыш гэтага, будзе каштаваць 2545,9 рубля (такі зараз сабекошт 1 кубаметра вады).

У Міністэрстве ЖКГ запэўніваюць, што перад тым, як увесці гэтую норму, яны дэталёва прааналізавалі спажыванне вады ў Беларусі. Вынікі гэтага аналізу паказалі, што фактычнае спажыванне вады ў добраўпарадкаванай кватэры, абсталяванай прыборамі індывідуальнага ўліку расходу вады, склала ў 2010 годзе ў Мінску і абласных цэнтрах 153 л на чалавека ў суткі. У населеных пунктах з колькасцю насельніцтва больш за 50 тыс. чалавек гэты паказчык роўны 141 л на чалавека ў суткі.

СТАР. 4

**Для параўнання:**

*сярэднестатыстычны жыхар большасці развітых еўрапейскіх краін расходуе ў месяц недзе150 л (4.5 куб. метраў) вады. У Германіі, Францыі, Швецыі гэты паказчык складае 130-140 л на чалавека ў суткі.*

ISSN 1990 - 763X

# МЫ ЎСЕ Ў АДКАЗЕ ЗА НАШУ КРАІНУ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Рубінава А.М. на адкрыцці сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання

*3 кастрычніка 2011 г.*



Фота БЕЛТА.

**Паважаныя члены Савета Рэспублікі!**

**Паважаныя запрошаныя і журналісты!**

Сёння мы пачынаем работу сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання. У перыяд гэтай сесіі нам трэба будзе разгледзець і прыняць шэраг адказных заканадаўчых рашэнняў, накіраваных на забеспячэнне дынамічнага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Але ў першую чаргу хачу спыніцца на тых пытаннях, якія сёння хвалююць усё наша грамадства.

На жаль, апошнім часам у краіне абвастрыліся фінансавыя праблемы, перш за ўсё звязаныя з валютай. Гэта прывяло да павышэння цэн на прадукты харчавання і тавары і, як вынік, пэўнае зніжэнне пакупной здольнасці насельніцтва. Але мы павінны разумець, што ўсе гэтыя з'явы часовыя. Самае галоўнае — гэта тое, што рэальны сектар нашай эканомікі развіваецца вельмі паспяхова. У першым паўгоддзі па росце прамысловай вытворчасці Беларусь увайшла ў тройку краін-лідараў у СНД. Калі па краінах Садружнасці прамысловы рост у параўнанні з першым паўгоддзем 2010 года склаў 6 працэнтаў, то ў Беларусі амаль у два разы больш — 11,5 працэнта, а рост ВУП складае 110 працэнтаў.

Назіраецца добрая дынаміка ў знешнім гандлі: тэмпы росту экспарту перавышаюць тэмпы росту імпарту. За ліпень-жнівень сальда знешняга гандлю ўпершыню за апошнія гады стала дадатным. Прычым не таму, што штучна зніжаны імпарт. Не, імпарт расце, але аб'ём экспарту расце яшчэ хутчэй, што сведчыць аб тым, што наша эканоміка набірае сілу.

СТАР. 2

# ПАСЛЯДОЎНА РУХАЮЧЫСЯ ДА ВЫЗНАЧАНЫХ МЭТ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на адкрыцці дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання



Фота БЕЛТА.

**Паважаныя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў!**

**Паважаныя запрошаныя і журналісты!**

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь сёння, 3 кастрычніка 2011 года, пачынае работу дзявятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

У міжсесіённы перыяд створаны сур'ёзны зачын па ўсіх напрамках заканадаўчай дзейнасці. Да разгляду на дзявятай сесіі рыхтуецца больш за 60 дакументаў.

Спектр пытанняў, якія нам трэба будзе разгледзець, даволі шырокі. Падрыхтаваныя законапраекты накіраваны на рэалізацыю стратэгіі эканамічнай і сацыяльнай мадэрнізацыі краіны, выпрацаванай чацвёртым Усебеларускім народным сходам, і вырашэнне задач, пастаўленых Кіраўніком дзяржавы.

Прыярытэтам сесіі, безумоўна, з'яўляецца прыняцце праекта Закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2012 год. Гэты дакумент павінен забяспечыць аптымальныя ўмовы для паступальнага, рытмічнага развіцця эканомікі і паслядоўнага выхаду на ўстаноўленыя параметры ў галіне сацыяльнай палітыкі. Тут асабліва будуць запатрабаваны прафесіяналізм і ініцыятыўнасць дэпутацкага корпуса, а галоўнае — наша веданне рэальнага стану спраў на месцах.

Прадоўжыцца работа па стымуляванні дзелавой актыўнасці. Гэтай мэце паслужаць далейшае спрашчэнне ліцэнзавання, карэкціроўка заканадаўства па пытаннях бюджэтных і падатковых адносін, удасканаленне Грамадзянскага кодэкса, а таксама аптымізацыя ўмоў развіцця рэкламнага рынку.

СТАР. 3

# МЫ ЎСЕ Ў АДКАЗЕ ЗА НАШУ КРАІНУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прыняты важныя рашэнні на валютным рынку, накіраваныя на ўмацаванне беларускага рубля. Сёння сітуацыя ўзята пад кантроль Урадам і Нацыянальным банкам. Арганізаваны асноўныя і дадатковыя біржавыя сесіі, ліквідаваны перадумовы для спекуляцыйных аперацый. Урад адмяніў абмежаванні на куплю валюты для імпарту абсталявання. Тым самым зроблены важныя захады для ўстанаўлення раўнаважнага валютнага курсу. Адзіны валютны курс зробіць рынак больш прадказальным, дасць магчымасць суб'ектам гаспадарання вярнуцца да нармальных умоў работы.

Разам з тым захаваны ранейшыя сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы перад насельніцтвам, прымаюцца дадатковыя меры ў інтарэсах грамадзян. Гэта сведчанне таго, што мы не маем намеру адыходзіць ад курсу на правядзенне сацыяльна арыентаванай эканамічнай палітыкі. Так, з пачатку года чатыры разы ажыццяўляліся пераразлікі пенсій у сувязі са змяненнем бюджэту пражытковага мінімуму. З 1 лістапада гэтага года будзе праведзены пераразлік працоўных пенсій зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў за трэці квартал 2011 года. Прадоўжана індэксаванне заработнай платы бюджэтнікаў у сувязі з ростам інфляцыі і цэн. Аказана аднаразовая матэрыяльная дапамога для сезоннай закупкі сельскагаспадарчай прадукцыі работнікам бюджэтнай сферы, непрацуючым пенсіянерам і грамадзянам, якія атрымліваюць асобныя віды сацыяльных дапамог. Будуць расці дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, стыпендыі, а таксама будуць прыняты іншыя меры сацыяльнай падтрымкі грамадзян. З 1 кастрычніка павышана тарыфная стаўка першага разраду, а з 1 лістапада ў бюджэтнай сферы будуць уведзены дадатковыя дыферэнцыяльныя даплаты. Мэта ўсіх гэтых мер — не дапусціць зніжэння ўзроўню жыцця нашых грамадзян.

Прынятыя Кіраўніком дзяржавы, Урадам і Нацыянальным банкам краіны рашучыя меры па забеспячэнні дынамічнага эканамічнага развіцця, узмацненні сацыяльнай абароны насельніцтва ў пэўнай ступені стабілізавалі спажывецкі рынак і знялі напружанасць у грамадстве.

Хачу яшчэ раз падкрэсліць: сённяшнія цяжкасці маюць часовы характар, і яны вырашальныя. Я перакананы — мы іх пераадолеем. Але пераадолеем, калі будзем самааддана працаваць кожны на сваім рабочым месцы. Сёння ніхто не павінен стаяць убаку, мы ўсе ў адказе за нашу краіну.

Несумненна, асаблівае месца ў вырашэнні бягучых пытанняў адводзіцца Нацыянальнаму сходу. Парламентарыі павінны падставіць плячо Кіраўніку дзяржавы пры вырашэнні неадкладных сацыяльна-эканамічных задач. Прынцыповае значэнне для гэтага, на мой погляд, будзе мець сёмая сесія, якая адкрываецца. Практычна кожны прыняты намі закон, кожны яго артыкул павінны працаваць на збалансаванае развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы, павышэнне дабрабыту насельніцтва, умацаванне нацыянальнай бяспекі і стабільнасці ў грамадстве.

Нашы планы на сёмую сесію ў многім вызначаны задачамі, якія былі пастаўлены на чацвёртым Усебеларускім народным сходзе, Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады і рашэннямі Кіраўніка дзяржавы на бягучы перыяд і на перспектыву.

У перыяд паміж сесіямі мы актыўна ўдзельнічалі ў заканатворчым працэсе. Пастаяннымі камісіямі Савета Рэспублікі сумесна з профільнымі камісіямі Палаты прадстаўнікоў, міністэрствамі і ведамствамі прапрацавана больш за 40 праектаў законаў і ўзгоднены 4 праекты ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Трэба сказаць, што такое супрацоўніцтва дае магчымасць ужо на ранняй стадыі ацаніць рыхтуемыя законапраекты, вызначыць іх адпаведнасць дзеючаму заканадаўству і ўплыў на жыццё нашай краіны.

Зразумела, у эканамічным блоку законапраектаў галоўнай стане работа над праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы 2012 год. Гэты асноўны эканамічны дакумент запатрабуе ад нас адказнага і прафесійнага падыходу пры яго падрыхтоўцы. Ён павінен быць збалансаваным і рэалістычным, адпавядаць магчымасцям дзяржавы забяспечваць нармальнае функцыянаванне эканомікі і сацыяльнай сферы, выконваць свае знешнія абавязацельствы і, у канчатковым выніку, закласці трывалы фундамент далейшага развіцця краіны.

У прыярытэтным парадку вядзецца работа над законапраектамі сацыяльнай сферы. Да іх можна аднесці законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс аб шлюбе і сям'і, які накіраваны на лібералізацыю пытанняў рэгістрацыі шлюбаў, узмацненне сацыяльнай абароненасці дзяцей-сірот, упарадкаванне пытанняў аб усынаўленні.

На ўзмацненне абароны дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, будуць накіраваны таксама папраўкі ў закон аб пашырэнні гарантый па сацыяльнай абароне гэтай катэгорыі асоб.

Прадоўжыцца работа па заканадаўчым забеспячэнні адносін у сферы аховы здароўя. У прыватнасці, трэба будзе ўрэгуляваць пытанні, звязаныя з санітарна-эпідэміялагічным дабрабытам насельніцтва, прадухіленнем небяспечных захворванняў, аказаннем псіхіятрычнай дапамогі, а таксама забеспячэннем гарантый правоў грамадзян пры прымяненні дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій.

Асаблівая ўвага будзе ўдзелена і рабоце над праектам Жыллёвага кодэкса. Сацыяльная значнасць гэтага прававога акта надзвычай вялікая. Ён датычыцца кожнага чалавека і прызначаны забяспечыць комплекснае ўрэгуляванне важнейшай сферы жыллёвых адносін. Важным новаўвядзеннем з'яўляецца пісьмовае пагадненне аб прызнанні членамі сям'і, якое будзе з'яўляцца адным з асноўных для ўзнікнення права карыстання жылым памяшканнем.

Прадугледжваецца прыняць шэраг заканадаўчых актаў, якія сістэмна рэгулююць пытанні барацьбы з карупцыяй, гандлем людзьмі, дзяржаўнымі і іншымі цяжкімі злачынствамі. У іх, напрыклад, пашыраецца пералік мер па стварэнні атмасферы нецярпімасці адносна карупцыі, забеспячэнні галоснасці ў дзейнасці дзяржаўных службовых асоб; на прававым узроўні вызначаецца сістэма мер па абароне і рэабілітацыі ахвяр гандлю людзьмі; прадугледжваецца таксама выключэнне для ваеннаслужачых тэрміновай службы такога віду пакарання, як накіраванне ў дысцыплінарную воінскую часць, з заменай яго іншымі альтэрнатыўнымі мерамі.

У ходзе сёмай сесіі трэба будзе разгледзець шэраг законапраектаў, накіраваных на забеспячэнне адпаведнасці прававога рэгулявання грамадскіх адносін рэальным палітычным і сацыяльна-эканамічным умовам. Важную ролю павінны адыграць, у прыватнасці, заканадаўчыя меры, накіраваныя на скарачэнне сферы ліцэнзавання, развіццё адносін арэнды і закладу, аптымізацыю адносін у сферы архіўнай справы і справаводства, культуры і кінематаграфіі, рэкламы, дзейнасці адвакатаў і іншыя.

Асаблівую ўвагу члены Савета Рэспублікі павінны ўдзяліць пытанням стварэння Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь. Плануецца ўнесці папраўкі амаль у 30 заканадаўчых актаў, у тым ліку ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс. Іх прыняцце дасць магчымасць забяспечыць працэсуальную незалежнасць следчых, належную якасць пракурорскага нагляду і ў цэлым павысіць эфектыўнасць сістэмы забеспячэння правапарадку і законнасці ў краіне.

У міжсесіённы перыяд створаны сур'ёзны зачын па развіцці прававой базы ў сферы міжнародных адносін.

Важнае значэнне для краіны будзе мець ратыфікацыя паправак да артыкулаў Пагаднення Міжнароднага валютнага фонду. Яны, у прыватнасці, датычацца перагляду квоты, якая адлюстроўвае адносную велічыню эканомікі нашай краіны ў сусветнай эканоміцы. Ратыфікацыя зацверджаных паправак дасць магчымасць Рэспубліцы Беларусь пашырыць сваё прадстаўніцтва і ўмацаваць свой голас у сістэме кіравання фондам.

Трэба будзе таксама ратыфікаваць шэраг пагадненняў паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі, у тым ліку пра будаўніцтва і ўвод у эксплуатацыю («пад ключ») на тэрыторыі нашай краіны атамнай электрастанцыі.

Да ратыфікацыі падрыхтаваны і пакет пагадненняў, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці дзейнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ва ўмовах узнікнення новых выклікаў і пагроз. Прадоўжыцца таксама работа па далейшым развіцці прававой базы Мытнага саюза.

У ліку нашых прыярытэтаў у міжсесіённы перыяд заставалася міжнародная і міжпарламенцкая дзейнасць. Члены Савета Рэспублікі ўдзельнічалі ў рабоце Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Парламентарыі дзвюх краін правялі змястоўныя пасяджэнні камісій па пытаннях знешняй палітыкі, па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю. Асобнай тэмай абмеркавання стала ўдасканаленне ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі ў Саюзнай дзяржаве і ўнясенне прапаноў па фарміраванні праекта бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2012 год.

Новы імпульс супрацоўніцтву Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай надаў афіцыйны візіт у Мінск Старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў У Банга. На сустрэчы ў Нацыянальным сходзе разгледжаны пытанні развіцця беларуска-кітайскага палітычнага дыялога, актывізацыі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, пашырэння гандлёва-эканамічных сувязяў і двухбаковых адносін у сферы навукі, культуры і адукацыі. Акрамя таго, былі падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў, а таксама шэраг міжурадавых пагадненняў.

Члены Савета Рэспублікі ў складзе беларускай парламенцкай дэлегацыі прынялі ўдзел у чарговай 20-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Бялградзе. Значным поспехам работы нашай дэлегацыі стала прыняцце на пленарным пасяджэнні падрыхтаванай беларускім бокам рэзалюцыі, якая датычыцца плана дзеянняў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па барацьбе з гандлем людзьмі.

Перспектывы развіцця адносін з Латвійскай Рэспублікай абмяркоўваліся ў Савеце Рэспублікі на сустрэчы з Дзяржаўным кантралёрам Латвіі Інгунай Судрабай.

Дэлегацыя Савета Рэспублікі ўдзельнічала ва ўстаноўчым пасяджэнні Штогадовай канферэнцыі рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства і ў пасяджэнні Бюро Камітэта рэгіёнаў Еўрапейскага саюза, якія прайшлі ў Познані.

Пашырэнню інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у Паўднёва-Усходняй Азіі будзе садзейнічаць атрыманне Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь статусу наглядальніка ў МПА АСЕАН. Гэта рашэнне, прынятае 21 верасня ў Пнампені на 32-й Генеральнай асамблеі гэтай арганізацыі, прадастаўляе нам шматбаковую пляцоўку для міжпарламенцкага дыялога з дзяржавамі — членамі АСЕАН.

У сесіённы перыяд важнейшай задачай будзе пашырэнне кантактаў з міжпарламенцкімі структурамі замежных краін. Важнай падзеяй стане правядзенне ў гэтым месяцы ў Мінску выязнога пасяджэння Савета Парламенцкай Асамблеі АДКБ. У канцы кастрычніка члены Савета Рэспублікі прымуць таксама ўдзел у планавых мерапрыемствах міжпарламенцкіх асамблей дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Парламенцкай асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

У рамках Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі нас чакае работа па фарміраванні і прыняцці саюзнага бюджэту на наступны год.

У першай дэкадзе кастрычніка плануецца візіт у Рэспубліку Беларусь нашых калег з парламента Рэспублікі Таджыкістан.

Наша дэлегацыя таксама прыме ўдзел у 125-й Асамблеі МПС.

Члены Савета Рэспублікі запрошаны наглядальнікамі за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў Прэзідэнта Кыргызскай Рэспублікі (30 кастрычніка) і выбараў дэпутатаў Дзяржаўнай Думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі (4 снежня).

У міжсесіённы перыяд мы ўдзялялі асаблівую ўвагу рабоце ў рэгіёнах. З удзелам членаў Савета Рэспублікі прайшло больш за 50 сесій мясцовых Саветаў дэпутатаў. Членамі Савета Рэспублікі аказвалася дапамога мясцовым органам улады ў рэалізацыі рэгіянальных і тэрытарыяльных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця, добраўпарадкавання, падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак грамадзян. Такое ўзаемадзеянне з рэгіянальнымі органамі ўлады набыло сістэмны характар і станоўча ацэньваецца на месцах.

Саветам па ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі праводзілася актыўная падрыхтоўка выязнога пасяджэння на базе Бярозаўскага раёна, дзе ў кастрычніку будзе разгледжана пытанне аб сумеснай рабоце органаў кіравання і самакіравання па стварэнні ўмоў для развіцця прадпрымальніцтва і прыцягненні інвестыцый.

Для ўзмацнення ўзаемадзеяння з мясцовымі Саветамі дэпутатаў членам Савета Рэспублікі неабходна актывізаваць правядзенне сустрэч з кіраўніцтвам мясцовых Саветаў дэпутатаў, у прыватнасці, сельскіх Саветаў. У цэнтры ўвагі гэтых сустрэч павінны знаходзіцца канкрэтныя пытанні жыцця рэгіёнаў і дзейнасці органаў мясцовага самакіравання па вырашэнні задач, пастаўленых Прэзідэнтам краіны ў рамках Дзяржаўнай праграмы ўстойлівага развіцця вёскі на 2011—2015 гады.

Важнейшай задачай для нас застаецца пастаянная работа са зваротамі грамадзян. У міжсесіённы перыяд членамі Савета Рэспублікі разгледжана амаль 8 тысяч вусных і пісьмовых заяў і скаргаў, у тым ліку непасрэдна ў Савеце Рэспублікі — больш за трыста. У іх людзі ўзнімалі пытанні работы жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, працы і сацыяльнай абароны, адукацыі, культуры, аховы здароўя, аховы сям'і, мацярынства і дзяцінства. Асобныя звароты змяшчалі канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні заканадаўства.

Відавочна, што падтрымка нашых грамадзян і своечасовае вырашэнне іх паўсядзённых запатрабаванняў — гэта і ёсць дзяржаўная палітыка. Людзі ацэньваюць дзейнасць улады праз прызму практычных спраў. Таму па кожным звароце, які паступіў да нас, павінна быць прынята канкрэтнае рашэнне. Нават калі пытанне невырашальнае, чалавек павінен атрымаць аператыўны і прафесійны адказ на сваю просьбу. У парламентарыях людзі павінны бачыць першых абаронцаў сваіх інтарэсаў. Для вырашэння гэтых пытанняў нам неабходна больш актыўна працаваць з дэпутацкім корпусам мясцовых Саветаў.

Важная роля ва ўдасканаленні работы з людзьмі адводзіцца інфармацыйнай дзейнасці Савета Рэспублікі. У міжсесіённы перыяд на старонках «Советской Белоруссии», «Народной газеты», «Звязды» і шэрагу рэгіянальных друкавых выданняў было падрыхтавана з удзелам нашых сенатараў і апублікавана больш за 150 матэрыялаў, якія датычацца дзейнасці Савета Рэспублікі і ў цэлым жыцця нашай краіны. Адбыўся шэраг выступленняў на радыё і тэлебачанні. У сесіённы перыяд неабходна яшчэ больш актыўна працаваць у гэтым напрамку, арганізуючы прэс-канферэнцыі, брыфінгі, прамыя тэлефонныя лініі ў рэдакцыях газет, тэле- і радыёстудыях.

Паважаныя калегі!

Наперадзе ў нас напружаная і змястоўная работа.

Жадаю вам поспехаў у парламенцкай і прафесійнай дзейнасці!

Дазвольце перайсці да разгляду пытанняў сённяшняга пасяджэння.

# ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ

## У няпросты час давядзецца парламентарыям прымаць галоўныя фінансавыя дакументы краіны

Парламенцкі дзённік

З-за цьмянай сітуацыі на валютным рынку фарміраванне бюджэту на будучы год было перанесена на кастрычнік — лістапад. Але ў работу над дакументам парламентарыі ўключыліся яшчэ ў сакавіку. Напрацоўкамі падзяліўся з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы Аляксандр АНТОНЕНКА**. Які кошт на газ закладваецца ў праект? Пры распрацоўцы дакумента «часта гучыць лічба 288 долараў за тысячу кубаметраў», распавёў дэпутат, але які́м дакладна будзе кошт, сёння яшчэ ніхто не ведае. Бо налета да Беларусі пачнуць прымяняць паніжальны інтэграцыйны каэфіцыент. Чарговы газавы кантракт 2012 — 2014, як чакаюць парламентарыі, падпішуць у лістападзе — снежні. Тады сітуацыя стане больш відавочнай.

Асноўныя артыкулы выдаткаў, паводле інфармацыі спадара Антоненкі, захаваюцца ў будучым бюджэце, і ён застанецца сацыяльна арыентаваным. Народны выбраннік канстатаваў, што на спажывецкім рынку сёння не ўсё стабільна. Але аптымізму не губляе: «Мы разлічваем на спыненне росту цэн, а магчыма, і зніжэнне», — дзеліцца сваім меркаваннем дэпутат. Падставу для такіх разваг яму дае нядаўняя тэндэнцыя да ўмацавання беларускага рубля. «Мы хацелі б, каб урад больш актыўна ўмешваўся ў працэсы эканомікі», — падкрэслівае парламентарый. У прыватнасці, гэта датычыцца фарміравання цэн.

**Міністр замежных спраў Беларусі Сяргей МАРТЫНАЎ** прэзентаваў у Авальнай зале дакументы для ратыфікацыі, якія дазволяць павысіць эфектыўнасць дзейнасці АДКБ, што асабліва актуальна, бо наша краіна якраз старшынствуе ў арганізацыі. Пасля выступлення кіраўнік знешнепалітычнага ведамства пракаментаваў журналістам нядаўнія пасажы з Усходнім партнёрствам. Беларусь не ўзяла ўдзелу ў саміце, але ўдзел ва Усходнім партнёрстве, паводле слоў міністра, захоўваецца. С. Мартынаў адзначыў, што ў праграме ёсць шэраг недахопаў, і галоўны з іх — адсутнасць рэальных, практычных спраў. Беларускі бок настойвае, каб большы акцэнт рабіўся на праектную дзейнасць. Аналагічнага меркавання, паводле слоў кіраўніка МЗС, прытрымліваюцца і іншыя краіны-партнёры. Ён распавёў, што Беларусь прапанавала ўжо больш як 20 праектаў сумесна з Літвой і Украінай. Ідзе сур'ёзная карпатлівая работа на экспертным узроўні па ўзаемадзеянні мытных органаў, супрацоўніцтве ў энергетыцы, барацьбе з карупцыяй, кіберзлачыннасцю, наркатрафікам. Таму, пры ўсіх недахопах, якія знаходзіць Беларусь ва Усходнім партнёрстве, яна бачыць таксама і карысць. У патэнцыяле.

Папярэдзіў міністр і магчымыя інсінуацыі на тэму памілавання Дзмітрыя Уса, асуджанага за ўдзел у акцыі 19 снежня: гэты крок не з'яўляецца пачаткам выканання патрабаванняў, якія вылучае ЕС перад Беларуссю. «Гэта не значыць, што мы займаемся выкананнем чыіх-небудзь патрабаванняў, мы выконваем уласныя законы. У краіне прымаюцца рашэнні, зыходзячы з яе ўласных патрэб».

У **першага намесніка міністра фінансаў Уладзіміра АМАРЫНА**, які прадстаўляў для ратыфікацыі дакумент, дзякуючы якому павялічыцца права голасу Беларусі ў МВФ, дэпутаты цікавіліся злабадзённым. Сітуацыяй на валютным рынку краіны. Пыталіся, ці ёсць неабходнасць у знешнім запазычанні і якія перспектывы атрымаць яго ў МВФ. Спадар Амарын паведаміў, што ў найбліжэйшы час да нас прыязджае місія Міжнароднага валютнага фонду. Яна будзе працаваць тут з 4 па 18 кастрычніка. «Магчыма, па выніках работы місіі будзе разглядацца пытанне аб новай праграме з МВФ», — кажа першы намеснік міністра. Ён акцэнтаваў, што абавязацельствы па ранейшых пазыках Беларусь выконвае своечасова. Сума новага крэдыту, на які можа разлічваць Беларусь, абмяжоўваецца 7 млрд долараў. У. Амарын не выключае, што новая праграма будзе дастаткова жорсткай ва ўмовах — нават больш жорсткай, чым вылучэнне сродкаў з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. Чарговы транш, дарэчы, Беларусь павінна атрымаць да канца месяца, адзначае першы намеснік міністра фінансаў. Сума складзе 440 млн долараў.

Пра фінансы ішла размова і ў верхняй палаце парламента. Дагэтуль у таргах валютай на дадатковай сесіі абыходзілася без уліванняў Нацбанка. Аднак, магчыма, у кастрычніку інтэрвенцыі спатрэбяцца, «каб не даць рэзкага скачку долару ўверх», як заўважыла **Надзея ЕРМАКОВА, старшыня праўлення Нацбанка**. Яна ўдакладніла, што валютныя інтэрвенцыі магчымы толькі за кошт сродкаў, якія атрымалася назапасіць за два мінулыя месяцы.

Нацбанк пакуль не вызначыўся ў неабходнасці далейшага павышэння стаўкі рэфінансавання. Сёння яна складае 30 адсоткаў. «Стаўка рэфінансавання павінна быць крыху вышэй за інфляцыю, ці як мінімум побач з ёй», — інфармуе старшыня праўлення. Прыблізна ў першай дэкадзе кастрычніка ў распараджэнні Нацбанка будзе статыстыка па інфляцыі, тады сумесна з урадам і будзе прымацца рашэнне.

— У прынцыпе, сёння стаўка рэфінансавання перастала адыгрываць сваю ролю. Адсоткі па ўкладах насельніцтва нашмат вышэйшыя і дасягаюць 40—45%, крэдыты таксама дасягаюць 40%, — тлумачыць кіраўнік галоўнага банка краіны. — Калі мы стаўку будзем павышаць, яна ўсё роўна не дасягне інфляцыі. Калі зрабіць яе 80 адсоткаў, мы можам практычна спыніць эканоміку. У пэўныя перыяды стаўка рэфінансавання не спрацоўвае.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

# ПАСЛЯДОЎНА РУХАЮЧЫСЯ ДА ВЫЗНАЧАНЫХ МЭТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы разгледзім праект Закона «Аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», які мае прынцыповае значэнне для фарміравання інавацыйнага аблічча краіны. Нам трэба будзе выйсці на стварэнне такога прававога механізма, пры якім крэдытная, падатковая, мытная палітыка стане дзейсным стымулам павышэння інавацыйнай актыўнасці ва ўсіх сферах эканомікі.

Своечасовымі з'яўляюцца меры, накіраваныя на зніжэнне рызык, звязаных з развіццём рыначных адносін. У прыватнасці, размова ідзе аб стварэнні прававых умоў для стабілізацыі дзейнасці прадпрыемстваў, якія аказаліся на мяжы банкруцтва, а таксама спынення выпадкаў рэйдарства. Прыняцце праекта новага Закона «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)» дасць магчымасць павысіць устойлівасць жыццёва важных для краіны вытворчасцяў і тым самым умацаваць эканамічную бяспеку дзяржавы.

У полі нашага зроку будуць знаходзіцца і пытанні абароны правоў спажыўцоў. Папраўкі, якія ўносяцца ў адпаведны закон, спросцяць вырашэнне праблем, што ўзнікаюць па віне нядобрасумленных прадаўцоў і вытворцаў тавараў. Расходы, звязаныя з аказаннем паслуг грамадскімі аб'яднаннямі спажыўцоў, будуць кампенсавацца за кошт вінаватага боку.

Нягледзячы на часовыя фінансава-эканамічныя цяжкасці, дзяржава паслядоўна рэалізуе курс на павышэнне якасці жыцця грамадзян. Гэта пацвярджае і той аб'ём нашы пакет дакументаў сацыяльнага блока, якія мы плануем разгледзець на працягу сесіі. Тут адзначу ў першую чаргу рашэнні па развіцці сферы аховы здароўя. У ліку найбольш рэзанансных трэба назваць праекты законаў «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва», «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях», «Аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека». Пры гэтым падкрэслю, што два апошнія законапраекты з'яўляюцца новымі для нашай прававой сістэмы.

Не менш значныя рашэнні будуць прыняты і ў сферах прававога рэгулявання сямейных адносін, а таксама абароны правоў і інтарэсаў дзяцей, у тым ліку права на жылое памяшканне такой слабаабароненай катэгорыі, як дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў.

На фінальную стадыю выйшла работа над праектам Жыллёвага кодэкса. Уступленне ў сілу яго палажэнняў дасць магчымасць зняць многія існуючыя праблемы ў гэтай галіне, уключаючы пытанні ўласнасці, адчужэння жылля, іпатэкі.

Развіццё прававых інстытутаў непарыўна звязана з практыкай судовага вырашэння спрэчак. Менавіта гэтым абумоўлена актуальнасць удасканалення заканадаўчых асноў судаводства. У ходзе сесіі мы абмяркуем пытанні ўвядзення працэдуры завочнага разбору грамадзянскіх спраў, пашырэння паўнамоцтваў судоў другой інстанцыі пры разглядзе крымінальных спраў, інакш кажучы, гэта разгляд спраў па сутнасці і вынясенне прыгавораў у судзе касацыйнай інстанцыі. Прадугледжваецца таксама развіццё практыкі пазасудовага спагнання грашовых сум з даўжніка па выканаўчым надпісе натарыуса. Усе гэтыя меры дадуць магчымасць зніжаць нагрузку на суды, а такім чынам больш эфектыўна абараняць правы грамадзян і юрыдычных асоб.

Важны крок будзе зроблены ў сфера рэфармавання адвакатуры. Прыняцце праекта адпаведнага закона будзе садзейнічаць павышэнню якасці аказваемай адвакатамі юрыдычнай дапамогі, іх прафесіяналізму і адказнасці.

Шэраг сур'ёзных рашэнняў трэба будзе прыняць у сферах нацыянальнай бяспекі, забеспячэння законнасці і правапарадку. Гэта ў першую чаргу праект Закона аб процідзеянні гандлю людзьмі і папраўкі ў Закон аб барацьбе з карупцыяй.

Значная ўвага будзе ўдзелена пытанням папярэджання правапарушэнняў у маладзёжным асяроддзі. Плануецца ўвесці абмежаванне на знаходжанне непаўналетніх ва ўзросце да шаснаццаці гадоў у грамадскіх месцах у начны час без суправаджэння дарослых. Ажыццяўляецца комплексная карэкціроўка Закона «Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх». Трэба будзе разгледзець законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах і іх прэкурсорах», накіраваны на ўдасканаленне сістэмы дзяржаўнага кантролю за абаротам наркатычных сродкаў і прафілактыкі іх спажывання перш за ўсё сярод дзяцей і моладзі.

Адначасова прадоўжыцца работа па ўдасканаленні крымінальнага заканадаўства. Адносна ваеннаслужачых тэрміновай службы прадугледжваецца выключэнне пакарання за воінскія злачынствы ў выглядзе ўтрымання ў дысцыплінарнай воінскай часці.

Умацаванню іміджу нашай краіны як дзяржавы, якая эфектыўна ўкараняе нормы міжнароднага гуманітарнага права, будзе садзейнічаць новая рэдакцыя Закона «Аб Беларускім Таварыстве Чырвонага Крыжа».

Міжнародная дзейнасць Палаты прадстаўнікоў у міжсесіённы перыяд была накіравана на далейшае развіццё міжпарламенцкіх кантактаў і пашырэнне інтарэсаў краіны на міжнароднай арэне.

Ініцыятыўным быў удзел нашай парламенцкай дэлегацыі ў 20-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, асноўнай тэмай парадку дня якой было абмеркаванне пытанняў павышэння эфектыўнасці і дзейнасці гэтай арганізацыі. Шэраг паправак беларускага боку, у тым ліку якія датычацца рэформы АБСЕ, адобраны ўдзельнікамі пасяджэння. Беларуская дэлегацыя таксама прадставіла заяву па ўзгодненай пазіцыі дэлегацый краін — членаў АДКБ па рэформе АБСЕ. Сур'ёзным поспехам стала вынясенне на пленарнае пасяджэнне сесіі падрыхтаванай беларускім бокам рэзалюцыі «Ажыццяўленне Глабальнага плана дзеянняў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па барацьбе з гандлем людзьмі» і яе аднадушнае прыняцце.

Менш за два тыдні таму адбылася падзея, якая мае выключнае значэнне для пашырэння міжнародных кантактаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. У ходзе 32-й Генеральнай асамблеі Міжпарламенцкай асамблеі Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі беларускаму Парламенту быў прадастаўлены статус наглядальніка ў гэтай аўтарытэтнай арганізацыі.

Перад намі адкрываюцца новыя магчымасці для развіцця супрацоўніцтва ў адным з самых перспектыўных рэгіёнаў свету.

У АСЕАН уваходзяць дзесяць дзяржаў — Бруней, В'етнам, Інданезія, Камбоджа, Лаос, Малайзія, М'янма, Сінгапур, Тайланд і Філіпіны. Гэта прыкладна 600 мільёнаў насельніцтва. Сукупны ВУП гэтых краін складае 1,9 трыльёна долараў ЗША. Аб палітычнай вазе гэтай уплывовай арганізацыі сведчыць і той факт, што статус наглядальніка ў ёй маюць парламенты Аўстраліі, Індыі, Канады, Кітая, Новай Зеландыі, Папуа — Новай Гвінеі, Рэспублікі Карэя, Расіі, ЗША, Японіі, а таксама Еўрапейскі парламент.

Прадаўжалася актыўная работа дэпутатаў у Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД. На планавай аснове праводзіліся пасяджэнні камісій гэтых міжнародных арганізацый. Напярэдадні гадавіны СНД дэпутаты прынялі актыўны ўдзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі на тэму «20 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў», якая праходзіла ў г. Мінску.

Ключавым мерапрыемствам праграмы двухбаковага міжпарламенцкага супрацоўніцтва быў афіцыйны візіт у Рэспубліку Беларусь кітайскай парламенцкай дэлегацыі на чале са Старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў У Банга. У ходзе візіту падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў Кітайскай Народнай Рэспублікі, а таксама пакет двухбаковых дакументаў міжурадавага характару. Без перабольшання, адкрыта новая старонка ва ўзаемадзеянні парламенцкіх дзвюх краін.

У перыяд паміж сесіямі прайшлі сустрэчы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з парламентарыямі Вялікабрытаніі, Ірака, Ірана, прадстаўнікамі дыпламатычнага корпуса замежных дзяржаў, акрэдытаванымі ў Рэспубліцы Беларусь.

Закранаючы планы нашай міжнароднай дзейнасці на чацвёрты квартал 2011 года, адзначу, што ў г. Мінску пройдзе пасяджэнне Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, у якім прадугледжваецца ўдзел кіраўнікоў парламентаў дзяржаў — членаў АДКБ.

Чакаюцца візіты ў Беларусь парламенцкіх дэлегацый Эстоніі і Ірана. Плануецца афіцыйны візіт нашай парламенцкай дэлегацыі ў Азербайджанскую Рэспубліку.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прымуць удзел у міжнародным наглядзе за прэзідэнцкімі выбарамі ў Кыргызскай Рэспубліцы і парламенцкімі выбарамі ў Расійскай Федэрацыі, а таксама ў планавых мерапрыемствах па лініі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, парламенцкіх структур СНД, ЕўрАзЭС і АДКБ.

Напружаная работа чакаецца ў рамках асенняга пасяджэння Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Харватыі, 125-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза ў г. Берне, пасяджэнняў парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва і іншых міжпарламенцкіх арганізацый.

Важнейшым напрамкам нашай дзейнасці была і застаецца непасрэдная работа з выбаршчыкамі. У міжсесіённы перыяд дэпутаты разгледзелі больш за 2700 зваротаў і прынялі больш за 3000 грамадзян. Вельмі важна, каб сувязь з людзьмі не слабела. Трэба прадаўжаць адкрыты дыялог па ўсіх злабадзённых пытаннях і аказваць максімальнае садзейнічанне мясцовым органам улады ў аператыўным вырашэнні праблем насельніцтва, абароне найбольш слабаабароненых катэгорый грамадзян.

Паважаныя калегі!

Як відаць з абазначаных планаў, сесія будзе даволі напружаная. Важна падкрэсліць і тое, што яна пройдзе пад знакам 15-годдзя з дня ўтварэння Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Для нас гэта нагода яшчэ раз прааналізаваць нашу работу, каб павысіць яе эфектыўнасць.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за добрую падрыхтоўку да сесіі і пажадаць плённай работы.

# «Лавачка» па перапродажы ліквідных зямельных участкаў закрываецца

**ПРЫКЛАДНА так ахарактарызаваў будучую рэалізацыю Указа кіраўніка дзяржавы № 431 ад 23 верасня 2011 года, дзе прадугледжваецца ўдасканальванне па лініі канфіскацыі, вылучэння і выкарыстання зямельных участкаў, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэй ГАЕЎ.**

У апошнія гады так адбылося, што пэўная частка чаргавікоў, што атрымлівалі зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля на льготных умовах ці ўвогуле бясплатна, даволі хутка маглі адшукаць механізмы перапродажу такой нерухомай маёмасці ўжо па рынкавым кошце. На зямельным участку вялося мінімальнае будаўніцтва, потым аб'ект кансерваваўся, а пасля рэгістрацыі прадаваўся.

Каб выключыць скрыты перапродаж зямельных участкаў, указам вызначана норма, па якой забараняецца адчужэнне зямельных участкаў на працягу 8 гадоў пасля дзяржаўнай рэгістрацыі жыллёвай нерухомасці на гэтых землях. Тут маюцца на ўвазе зямельныя ўчасткі, што былі выдзелены на льготных умовах грамадзянам з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Раней вызначанага тэрміну адчужэнне такіх зямельных участкаў і аб'ектаў нерухомасці магчыма ажыццяўляць толькі непасрэдна мясцовым выканаўчым камітэтам. Продаж грамадзянамі незавершаных закансерваваных пабудоў на зямельных участках чаргавікоў увогуле забараняецца, за выключэннем адчужэння мясцовым выканаўчым камітэтам. Цяпер перад падачай адпаведнай заявы чалавек павінен будзе сур'ёзна ўзважыць свае патрэбы і магчымасці: ці сапраўды ён збіраецца будавацца на зямельным участку і жыць там, або існуе нейкае іншае меркантыльнае пытанне.

Дзеянне гэтага ўказа ўступае ў сілу з першых дзён наступнага года. Андрэй Гаеў упэўнены, што з гэтага часу нейкая спекуляцыя зямельнымі ўчасткамі ў Беларусі будзе спынена.

Гэты ўказ уводзіць мноства наваўвядзенняў для актывізацыі бізнэсу і ўцягвання зямельных участкаў у гаспадарчы абарот. У прыватнасці, цяпер тыя, хто мае зямельныя ўчасткі, якія выдзелены для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, могуць выкарыстоўваць свае надзелы і для іншых мэт. Так, згодна з рашэннем мясцовага выканаўчага камітэта, участкі магчыма выкарыстоўваць і па сваім асноўным мэтавым прызначэнні, а таксама для рамеснай дзейнасці, дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, прадпрымальніцкай дзейнасці.

Асобна Андрэй Гаеў паведаміў карэспандэнту «Звязды», што ў жыллёвым сектары грамадзянам не дазволяць займацца нейкай прамысловай вытворчай дзейнасцю, або займацца тым, што можа пагоршыць экалагічны ці санітарны стан суседзяў.

Гэты ўказ дае магчымасць атрымліваць зямельныя ўчасткі чаргавікам для будаўніцтва і абслугоўвання жылых дамоў на праве прыватнай уласнасці бясплатна толькі шматдзетным сем'ям. Усе астатнія чаргавікі змогуць атрымаць зямельныя ўчасткі ва ўласнасць пасля аплаты ў памеры 20 ці 50 працэнтаў ад кадастравага кошту зямельнага ўчастка. Канчатковы памер такой платы для кожнага асобнага чаргавіка будзе вызначацца персанальна (тут улічваецца час пастаноўкі грамадзяніна на жыллёвы ўлік, наяўнасць у яго кватэр, жылых дамоў, зямельных участкаў і г.д).

Для актывізацыі гаспадарчага абароту ўказам дазваляецца ажыццяўленне здзелак з зямельнымі ўчасткамі паміж грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі. Да апошняга часу свой жылы дом і зямельны ўчастак прыватны гаспадар мог прадаць толькі іншай фізічнай асобе ці мясцоваму выканкаму.

Са студзеня 2012 года ўладальнікі ліквідных зямельных участкаў атрымаюць магчымасць прадастаўляць у якасці залогу банкам нават свае цалкам пустыя надзелы. Сёння зямля без зарэгістраванага на ёй аб'екта нерухомасці ў залог банкамі не прымаецца. Спецыялісты ўпэўнены, што гэты аспект стане першай рэальнай «ластаўкай» у развіцці айчыннай іпатэкі.

Андрэй Гаеў адзначыў, што да пачатку наступнага года ў Беларусі будзе распрацаваны новы алгарытм пастаноўкі ў чаргу для атрымання зямельных участкаў па лініі індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва.

Цяпер у Мінскай вобласці і ў рэгіёнах існуюць розныя падыходы па фарміраванні такой чаргі. У сталічным рэгіёне дзейнічаюць ажно чатыры чаргі для розных сацыяльных груп, у іншых абласцях — менш.

У наступным годзе ў краіне будзе існаваць адзіны зразумелы ўсім механізм пастаноўкі ў чаргу на зямельныя ўчасткі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### Аляксандр Лукашэнка памілаваў яшчэ аднаго асуджанага за ўдзел у вулічных беспарадках 19 снежня 2010 года ў Мінску

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, кіруючыся прынцыпамі гуманнасці, памілаваў яшчэ аднаго з асуджаных за ўдзел у вулічных беспарадках 19 снежня 2010 года ў Мінску. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 1 кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

### Развіццё ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах адпавядае інтарэсам народаў Беларусі і Германіі

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Федэральнага Прэзідэнта Федэратыўнай Рэспублікі Германія Крысціяна Вульфа і грамадзян гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём германскага адзінства.**

«Перакананы, што пашырэнне палітычнага дыялога і далейшае развіццё ўзаемавыгаднага двухбаковага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах адпавядаюць інтарэсам народаў нашых краін», — гаворыцца ў віншаванні.

### Аляксандр Лукашэнка павіншаваў артыстку балета Ірыну Савельеву з юбілеем

Дзякуючы непаўторнаму таленту і вялікай працаздольнасці вы сталі адным з буйных майстроў харэаграфічнага мастацтва Беларусі», — гаворыцца ў віншаванні.

«Цяпер вы з натхненнем перадаеце свае веды і вопыт вучням. Пры вашым удзеле ў сценах Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа выхаваны многія вядомыя беларускія артысты балета, чые шматлікія перамогі на прэстыжных конкурсах ярка сведчаць аб гэтым», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў артыстцы, каб і ў далейшым яе творчасць вызначалася павагу і ўдзячнасць, а таксама здароўя, шчасця, бадзёрасці і дабрабыту.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Уладзімір МАКЕЙ:

### «УРАД І НАЦБАНК ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ УСЁ ДЛЯ ХУТЧЭЙШАГА НАРОШЧВАННЯ ЗОЛАТАВАЛЮТНЫХ РЭЗЕРВАЎ»

**Урад і Нацбанк павінны зрабіць усё магчымае для хутчэйшага нарошчвання золатавалютных рэзерваў да ўзроўню, які надзейна забяспечваў бы эканамічную бяспеку дзяржавы. Аб гэтым заявіў ўчора на пасяджэнні сёмай Сесіі Савета Рэспублікі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей, прадстаўляючы сенатарам Надзею Ермакову ў якасці старшыні праўлення Нацыянальнага банка, передае БЕЛТА.**

Нацбанк Беларусі павінен захаваць прадказальнасць і кіруемасць у грашова-крэдытнай і банкаўскай сферы, падкрэсліў Уладзімір Макей.

Прынцыпам эмісійнай палітыкі Нацбанка павінна стаць ажыццяўленне крэдытнай эмісіі выключна на рыначных умовах.

Не менш важнай задачай ён назваў вяртанне даверу насельніцтва да беларускага рубля як да сродку збераження. «Ключ да паспяховага вырашэння гэтай задачы ляжыць у стабілізацыі нацыянальнай валюты, нізкай інфляцыі і гарантаванай абароне ўкладаў ад абясцэньвання. Таму Нацбанку і камерцыйным банкам трэба будзе прыкласці ўсе намаганні для вяртання ў банкаўскую сістэму збераженняў насельніцтва і іх далейшага нарошчвання», — сказаў кіраўнік адміністрацыі.

Уладзімір Макей таксама падкрэсліў, што з прыходам Надзеі Ермаковай у Нацбанк «спыніліся ўнутраныя марныя дыскусіі ў гэтай структуры як і з дапамогай якіх інструментаў аднаўляць унутраны валютны рынак».

# ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)*

Так што пытанне пакуль адкрытае. Але ад цаны пытання залежыць працэнт, пад які Нацбанк будзе падмацоўваць камерцыйныя банкі стандартнымі інструментамі. Штодня ён крэдытуе пад 40 адсоткаў «Беларусбанк» і «Белаграпрамбанк». «Мы такім чынам можам разарыць банкі і страціць эканоміку», — робіць высновы Н.Ермакова. Попыт на крэдыты з боку прадпрыемстваў зніжаецца, але пакуль недастаткова.

Магчымасці знешняй пазыкі ёсць: прынцыповая згода атрымана ўжо ад Ірана, паведамляе кіраўнік Нацбанка. Сума складзе 400 млн долараў. Паступленні чакаюцца таксама з Расіі: у памеры 1 млрд долараў. Таму і не дзіўна, што ключавым прынцыпам налета, паводле выразу Надзеі Ермаковай, будзе «жыць па сродках».

Галоўная мэта падначаленай ёй структуры сёння — збліжэнне курса на асноўнай і дадатковай сесіях. Устанаўленне новага афіцыйнага курсу беларускага рубля і адмова ад дадатковай сесіі таргоў не за гарамі, калі верыць прагнозу старшыні Нацбанка. «Неабходны яшчэ месяц, магчыма, паўтара, каб убачыць раўнаважны курс. Мабыць, нам трэба пратрымацца яшчэ два тыдні, каб пераканацца, што курс сапраўды раўнаважны». Такую выснову можна будзе зрабіць у выпадку, калі на працягу двух тыдняў адбудзецца збліжэнне курсу попыту і прапановы. Так ці інакш, любая акрэсленасць у нас цяпер цэніцца на вагу золата.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# Дыферэнцыраваная аплата за ваду: ЛІЧЫМ І ЭКАНОМІМ

**Як зэканоміць?**

Ва ўсіх цывілізаваных краінах ваду навучыліся эканоміць ужо даўно. Час гэта рабіць і нам. Тым больш, сучасная бытавая тэхніка гэта дазваляе. Так, вядома, што пральная машына спажывае ў чатыры разы менш вады, чым хатняя гаспадыня, якая займаецца мыццём уручную. Але больш за ўсё зэканоміць дапаможа сучасная сантэхніка — перш за ўсё змяшальнікі вады і бачок унітаза.

Калі вы збіраецеся мяняць сантэхніку, то памятайце: рычаговые (з адной ручкай) змяшальнікі маюць перавагу перад звычайнымі: у іх больш хутка змешваецца гарачая і халодная вада. А гэта значыць, што перыяд часу паміж уключэннем крана і атрыманнем вады патрэбнай тэмпературы памяншаецца (адпаведна, памяншаецца і неапраўданы расход вады). Шаравыя краны ў некалькі разоў больш эканомныя за вентыльныя, паколькі перакрываюць паток імгненна. Сучасныя зліўныя бачкі з падвойным злівам — вялікім і малым — таксама стаяць на варце эканоміі.

**Парады на кожны дзень**

● Ліквідуйце ўсе «працёкі». Няспраўны кран за суткі можа «накапаць» ад 30 да 300 літраў вады.

● Зачыняйце кран падчас чысткі зубоў і галення. Яшчэ лепш выкарыстоўваць не праточную ваду, а са шклянкі. Эканомія — ад 5 да 10 літраў на кожным «сеансе».

● Часцей прымайце душ замест ванны. Для поўнай ванны патрабуецца ў 3 разы больш вады, чым для душу, якім карыстаюцца 5-7 хвілін.

● Можна добра зэканоміць, калі ўсталяваць на душы замест звычайнага рассейвальніка больш эканамічны, з меншым памерам адтулін.

● Памятайце, што з цалкам адкрытага крана выцякае вады больш, чым вы думаеце: кожную хвіліну — да 15 літраў. Такім чынам, на мыццё бруднага посуду пад моцным струменем можа сысці звыш 100 літраў (у Еўропе нават выпускаюць краны, якія трэба доўга круціць, каб з іх паліўся моцны струмень).

Дарэчы, у некаторых украінскіх сем'ях ужо прыдумалі, як эканоміць ваду пры змыве ўнітаза, не змяняючы бачок на больш новы і эканамічны. У яго проста змяшчаюць пластыкавую бутэльку з вадой, і такім чынам аб'ём вады, што зліваецца, памяншаецца. А ў Галандыі ці Швецыі ні адной гаспадыні не прыйдзе ў галаву мыць посуд пад праточнай вадой: для іх гэта занадта затратна. Таму там выкарыстоўваюць затычкі для ракавін, а пасля мыцця посуд не спалоскваюць, а адразу выціраюць кухонным ручніком. (Мы не заклікаем вас рабіць гэтак жа, калі ў вас іншыя звычкі, а проста паказваем розныя спосабы эканоміі, якімі карыстаюцца іншыя людзі).

* * *

Дарэчы, новая сістэма дыферэнцыраванай аплаты за паслугі водазабеспячэння і водаадвядзення дазволіць на 6-6,5% паменшыць колькасць спажыванай вады. За год эканомія дасягне 22 мільёнаў кубаметраў — гэта аб'ём спажывання вады такімі гарадамі, як Магілёў або Гродна.

**Сярэднія нормы расходу вады**

- Ванна памерам 120*60*50 умяшчае 250 л вады; душ дапамагае зэканоміць ад 30 да 50% вады.
- Мыццё 3,5 кг бялізны — у сярэднім 36 л (залежыць ад мадэлі пральнай машыны); мыццё 4,5 кг — каля 45 л.
- 1 зліў бачка ўнітаза — да 5 л вады.

**Святлана БУСЬКО.**

**ДАРЭЧЫ**

*З 1 кастрычніка павышаны тарыфы на паслугі па тэхнічным абслугоўванні жылых дамоў — на 3%, на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння — на 3,2% і на электрычную энергію — на 15% (Пастанова Савета Міністраў ад 28 верасня 2011 года № 1300).*

**Зараз прыйдзецца плаціць за:**

● Тэхабслугоўванне — 350 рублёў за кв. м (было 340);

● Ацяпленне — 49 333,8 рублёў за Гкал (было 47 804,1)

● Электрычнасць, калі ёсць электрапліта — 189,3 рублёў (было 164,6). Калі электрапліты няма — 222,9 (было 193,8).

**Такім чынам, плацяжы сям'і з трох чалавек, якая пражывае ў тыповай двухпакаёвай кватэры, за жыллёва-камунальныя паслугі ўзрастуць у ацяпляльны перыяд на Br8,1 тыс.**

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.



*Беларуска Алеся Вазміцель выйграла залаты медаль на чэмпіянаце свету па пол-дэнсе, які праходзіў у Венгрыі.*
Фота Сіньхуа—БЕЛТА.

## ДОЛАР СТАМІЎСЯ І СПЫНІЎСЯ, КАБ АДПАЧЫЦЬ

**«Зялёны», напэўна, стаміўся пасля двухтыднёвага спуску. Пасля чарговай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы долар застаўся на ранейшым узроўні, таргі па еўра ўвогуле не праводзіліся з-за святаў у Еўропе, а расійскі рубель скінуў 4 рублі.**

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**Рынкавыя курсы на 3 кастрычніка:**

**Долар ЗША** — 7630 беларускіх рублёў;
**Еўра** — 10320 беларускіх рублёў;
**Расійскі рубель** — 234 беларускія рублі.

**Курсы некаторых банкаў на 3 кастрычніка:**

**«Беларусбанк»:** долар ЗША — 7550 і 7650; еўра — 9990 і 10275; расійскі рубель — 229 і 236.
**«Абсалютбанк»:** долар ЗША — 7580 і 7680; еўра — 10050 і 10350; расійскі рубель — 229 і 239.
**«Белінвестбанк»:** долар ЗША — 7500 і 7650; еўра — 9900 і 10450; расійскі рубель — 210 і 240.




**Гіганцкага сома вагой больш як 50 кг злавіў рыбак са Столінскага раёна**

*У вёсцы Белауша (Брэсцкая вобласць, Столінскі раён) на рацэ Гарынь мясцовы жыхар Сяргей Сень злавіў спінінгам сома вагой 51,5 кг.*

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.10.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША 5 704,00 | 1 чэшская крона 307,73 | USD 32,5890 |
| ▼ 1 еўра 7 608,57 | 1 польскі злоты 1722,01 | 10 UAH 40,7118 |
| 1 латвійскі лат 10 753,13 | ▼ 1 расійскі рубель 175,03 | 1000 BYR 57,7819 |
| 1 літоўскі літ 2 208,37 | 1 украінская грыўня 712,33 | EUR 43,4411 |

**Факт**

## СТАРАЖЫТНЫ ГОРАД НА УСХОДЗЕ БЕЛАРУСІ

**Крычаў адзначыў свой юбілей: гэтаму раённаму цэнтру споўнілася 875 гадоў.**

Гарадское свята адбылося 30 верасня, бо менавіта ў гэты дзень Крычаў вызвалілі ад фашысцкіх войскаў. Павіншаваць крычаўцаў прыехалі госці з суседніх раёнаў Магілёўшчыны, Расіі і Украіны. На падворках ад аграгарадкоў Крычаўскага раёна заклікалі гасцей спяваць і танцаваць пад гармонік, частавацца беларускімі прысмакамі. На гарадскім стадыёне праходзілі канцэрты. Навучэнцы мастацкай школы разгарнулі выставу, народныя майстры прапанаваўалі свае работы. Вялікую цікавасць выклікалі вядомыя ад старажытнасці крычаўскія гліняныя свістулькі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ГРЫБНЫЯ ГАЛЮЦЫНАЦЫІ

**Каля Магілёва тры маладыя чалавекі затрыманы з мяшэчкам «вясёлых» грыбоў.**

У міліцыі гавораць, што з падобнымі дарамі лесу яны сутыкаюцца другі год запар: дзіўна, што грыбы, радзімай якіх лічыцца Мексіка і Цэнтральная Амерыка, з'явіліся паблізу абласнога цэнтра. Так ці інакш, але яны ўтрымліваюць рэчыва, якое выклікае галюцынацыі. Збіральнікі грыбоў сцвярджалі, што яны прызначаліся для ўласнага карыстання, але галюцынагену павінна было б хапіць на некалькі соцень доз. Цяпер супраць маладых людзей распачата крымінальная справа.

**Алена КАЗЛОВА.**

## БОМЖ-ВЫМАГАЛЬНІК

**Цяпер, як вядома, ля пад'ездаў начуюць нават нятанныя машыны.**

Вось і вырашыў скарыстацца гэтай акалічнасцю адзін брэсцкі бомж. Ён пачаў пагражаць дырэктару сумеснай фірмы, што паб'е яго дарагое аўто, калі той не заплаціць 500 долараў. Дырэктар першыя «траншы» у памеры 100 долараў перадаў вымагальніку, але звярнуўся ў міліцыю. Бамжа затрымалі і пасадзілі ў камеру папярэдняга зняволення. А можа, «грамадзяніну свету» таго і трэба было: зіма хутка?

**Яна СВЕТАВА.**




АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ПМК-69» (продавец)** проводит открытый аукцион по продаже административно-хозяйственного здания (инв. № 623/С-39311), об. пл. 632,3 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, Узденский р-н, Озерский с/с, д. Королево, ул. Парковая, д. 1.**

**Начальная цена с НДС – 366 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – 0,0621 га.

Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Объект обременен договорами аренды.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора аукциона www.rlt.by.**

Аукцион состоится **03.11.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.11.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**


# ШЛЯХ ДА МОВЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Месца мовы на Беларусі — сярод звычайных вясковых хацін і шматпавярховых гмахаў, сярод працаўнікоў прадпрыемстваў і міністэрстваў. Яна павінна жыць!

Я ні ў якім разе не адмаўляю рускай мовы і не намагаюся навязаць сваё меркаванне, але вельмі балюча, калі чуеш ад бацькоў: «Маё дзіця будзе размаўляць выключна па-руску!» І мама, і тата, і шматлікае акружэнне ў прысутнасці дзіцяці ламаюць язык. Крыўдна не за іх, дарослых, а за маленькага чалавечка, у якога адабралі магчымасць ведаць родную мову.

Балюча, калі вочы чапляюцца за паведамленне на адным з сайтаў: «Тэрмінова патрабуюцца вучні ў беларускамоўную школу».

Балюча, калі замест «Села кошка на парожку...» вясковае трохгадовае дзіця дэкламуе «Мишка косолапый...». Ёсць столькі цудоўных дзіцячых вершаў айчынных паэтаў!

Балюча было, калі мы з дачкою на Вялікдзень пайшлі збіраць яйкі па вёсцы, у якой жыве мая бабуля, і на адказ малечы «Дзякуй за яйка» жанчына здзівілася:

— А чаму не «спасибо»?

І гэта ў вёсцы!

Чамусьці ў сваёй краіне дыскрымінацыя па моўнай прыкмеце працвітае. Здаецца, і грамадства ўжо вырасла з цэтлікаў «колхозник», «деревня». Вось толькі позірк, якім цябе адорвае прадавец, ці кандуктар, ці звычайны мінак, у якога цікавішся: «Як прайсці да...», — пранізліва-ацэньваючы і халодны-халодны, ад якога мурашкі паўзуць па спіне.

Напэўна, да гэтага трэба дарасці: хтосьці разумее і ў 18 гадоў, што мова — своя, а хтосьці і ў 50 не памятае наказу Ф. Багушэвіча. Усяму свой час.

Каюся: і я выракалася роднай мовы... Тады, калі правінцыяльнай дзяўчынкай прыехала вучыцца ва ўніверсітэт. Першы год прапрацавалася, а пасля, не вытрымаўшы націску, перайшла на рускую, толькі з самымі блізкімі сябрамі размаўляла «па-свойму».

І толькі нараджэнне дзіцяці прымусіла мяне задумацца і на пытанне: «Дзе месца беларускай мовы?» — даць адказ: «У сям'і».

Я выпрацавала звычку замест «пожалуйста» казаць «калі ласка», замест «спокойной ночи» — «дабранач» і канчаткова пераключылася на беларускамоўную літаратуру і перыёдыку. І была такой шчаслівай, калі аднойчы перад сном злавіла сябе на тым, што думаю па-беларуску.

Сваёй дачушцы я чытаю кнігі як на беларускай, так і на рускай мовах — праўда, у аўтарскім перакладзе, таму што кніг на беларускай мове для дзяцей малодшага ўзросту ў кніжных крамах зусім няма. А тыя кнігі, якія можна заказаць праз сеціва, вельмі саступаюць у дызайне і маляўнічасці сваім рускамоўным сабратам.

Мяне радуе, калі Саша, паснедаўшы, кажа мне «дзякуй». І ўчора ўвечары, калі мы шпацыравалі па вуліцы, дачка здзівіла мяне. Заўважыўшы на электрычных правадах птушак, яна пачала махаць рукой і крычаць ім: «Прывет!» Я паправіла: «Кажы — прывітанне!»

Яна — імгненна:

— Прывітанне. Як маешся?

У маёй мове актыўнага ўжывання «маешся» да гэтага часу не было.

Я не ўпэўнена ў тым, што размаўляю па-беларуску на адзнаку «добра», але я вучуся. Мы вучымся — і гэта наш шлях да мовы. Бо я не хачу адбіраць у сваёй дачкі магчымасць ведаць сваю мову з-за прымітыўных стэрэатыпаў. Я не хачу, каб яна, калі падрасце і будзе вучыцца ў горадзе, адчувала сябе «белай варонай» і саромелася беларускай мовы. Я хачу, каб яна ўспрымала беларускамоўнасць як норму, а не як выключэнне. Нават калі пасля яна абярэ для сябе рускую мову, я буду ведаць, што шлях быў недарэмным, бо я змагла ёй даць права выбару.

**Алена ГАНУЛІЧ.**

*Астравецкі раён.*

Прамая лінія

# Каб пазбавіцца ад храпу, часта дастаткова мінімальнай аперацыі

**На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае ўрач-фаніятр РНПЦ отарыналарынгалогіі Вольга РАДЗІВОНАВА.**

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 27 верасня.)***

***☎— Алена, Мінск. У 6-гадовай дачкі паўлічаны, аднак не моцна, адэноіды. Выдаляць іх не сталі. Але некаторыя ўрачы пытаюцца, чаму не выдалілі. На мой погляд, гэтага рабіць не трэба: дзіця хварэе не часта...***

— Адэноіды ёсць ва ўсіх дзяцей. Калі яны не турбуюць (няма сцякання гнойных выдзяленняў з носа, насаглоткі, храпу, насмарку, праблем з вушамі), адэноіды выдаляць не трэба. Можна прамываць нос настоем рамонку, растворам марской солі (у аптэках ёсць спецыяльна прыгатаваныя стэрыльныя растворы для прамывання носа), закапваць пасля гэтага некалькі кропель таго ж настою рамонку, пратарголу, кары дуба — 3-5 кропель. Калі ж на адэноідах накопліваецца гной, ідзе запаленчы працэс і яны самі з'яўляюцца крыніцай інфекцыі, іх прыходзіцца выдаляць. Але так павальна, як раней, іх зараз не выдаляюць: у нашым арганізме няма нічога лішняга. Яшчэ зусім нядаўна рэкамендавалі выдаляць адэноіды дзецям, якія часта хварэюць. Але даказана, што дзеці не перастаюць хварэць і пасля выдалення адэноідаў. Іх трэба лячыць комплексна, а не толькі па лініі ЛОР-урача. У кожнай нацыі свая канстытуцыя. Беларускія дзеці — пухленькія бландзіны з блакітнымі вачыма. У іх схільнасць да гіперплазіі лімфоіднай тканіны. Але з узростам гэта, як і дыятэз, праходзіць. Трэба садзейнічаць таму, каб яны змяншаліся, — здымаць запаленне. Як я казала, можна прамываць, закапваць вяжучыя кроплі. Падчас насмарку 10 дзён закапваць нос вышэйназванымі прэпаратамі 3 разы на дзень, а потым толькі на ноч — і так на працягу месяца. Ёсць гомеапатычныя прэпараты, якія ўплываюць на лімфоідную тканіну глоткі і носаглоткі.

***☎— Алена, Брэст. Я вакаліст, але займаюся непрафесійна: спяваю толькі ў выхадныя, 1-2 творы, а на тыдні рэпецірую. Спяваю рэгулярна. У мяне да вас некалькі пытанняў. І магчыма, прапанова: у Брэсце няма фаніятра, магчыма, спецыялісты вашага цэнтра маглі б выязджаць у камандзіроўкі да нас хоць раз на год...***

— Нашы спецыялісты выязджаюць, згодна з зацверджаным планам, прычым разам з сурдолагам, лагапедам у розныя рэгіёны рэспублікі. Гэтае пытанне вырашаецца на абласным і рэспубліканскім узроўні. Калі прыязджае група спецыялістаў з рэспубліканскага цэнтра, яны працуюць з найбольш складанымі пацыентамі, з якімі не змаглі разабрацца ўрачы на месцах. З вакалістамі ў нас крыху іншая практыка: некаторыя калектывы, напрыклад, звяртаюцца ў наш цэнтр з просьбай забяспечыць прафагляд, тады фаніятр выязджае або калектыў да яго прыходзіць у прызначаны дзень. Гэтыя пытанні таксама вырашаюцца на ўзроўні адміністрацыі.

***— Колькі мне, як непрафесіяналу, можна спяваць у дзень?***

— Лічыцца, што галасавы апарат пачынае адчуваць стому пасля трохгадзіннай галасавой нагрузкі. Пасля кожнай гадзіны трэба рабіць абавязковы 10-15-хвілінны перапынак: гэта поўны галасавы спакой. Больш за тры гадзіны ў дзень нагружаць галасавыя звязкі не рэкамендуецца. Многае залежыць ад таго, як у вас пастаўлена тэхніка. Студэнтам-вакалістам рэкамендуецца спяваць не больш за дзве гадзіны ў дзень. Прыслухоўвайцеся да сябе: калі ў вас з'яўляюцца непрыемныя адчуванні, пяршэнне, пачуццё цяжару ў шыі, горле, горш за тое, жаданне адкашляцца і хрыпатасць пасля галасавой нагрузкі — значыць, гэтая нагрузка для вас вялікая. Калі непрыемных адчуванняў вы не маеце, на працягу 2-3 гадзін вам камфортна і голас не мяняецца, калі ласка, спявайце. Магчыма, трэба паказвацца раз у паўгода ЛОР-урачу ці фаніятру.

***— Непрыемныя адчуванні ў мяне з'яўляюцца звычайна падчас спеваў у «крытычныя» дні...***

— Ваша гартань вам правільна падказвае. Гартань у крытычныя дні найбольш слабая, галасавыя складкі выглядаюць як падчас прастуды. Спяваць у такія дні, ды і ўвогуле нагружаць голас, трэба з асаблівай асцярожнасцю, а калі магчыма, то і цалкам выключыць галасавыя нагрузкі.

***— І які патрэбна зрабіць перапынак?***

— У вашым выпадку вы павінны даць сабе пару дзён для адпачынку, калі пройдзе гармананальны пік.

***— У мяне ёсць страх атрымаць вузялкі. Я мела праблемы ў асабістым жыцці, у гэты час спявала, і яны ў мяне ўтварыліся. Ад таго, што яны былі раней, ці ёсць небяспека зноў іх зарабіць?***

— Такіх, у каго не было вузялкоў, сярод вакалістаў-прафесіяналаў, напэўна, не бывае. Калінебудзь яны абавязкова ўзнікнуць ад галасавой перагрузкі, ад парушэння галасавога рэжыму. Гэта не значыць, што вы больш схільныя іх атрымаць, а значыць, што нешта было няправільна ў вашай манеры галасавядзення і вы нацэліліся гэтыя «мазалі». Але калі вы маеце такую насцярожанасць, то вам абавязкова трэба час ад часу паказвацца ўрачу.

***— Але калі рэпеціраваць 1-2 гадзіны, іх не будзе?***

— Вузялкі бываюць вострыя і хранічныя. Можна спець адну партыю і зарабіць вузялкі. А можна іх зарабляць гадамі, як у большасці непрафесіянальных спевакоў і здараецца. Вострыя вузялкі бываюць у спевакоў пры дастаткова моцнай нагрузцы. Тады дастаткова пару дзён памаўчаць — і яны разыходзяцца, праходзяць, як любы мазоль. А калі гэта хранічны вузялок, з-за няправільнай манеры голасавядзення, то ён быў, ёсць і будзе, з ім за два дні не справішся. Калі вы правільна спяваеце, пад кантролем педагога, упэўнены ў сваёй пастаноўцы голасу, не злоўжываеце, не фарсіруеце, спяваеце ваш дыяпазон, з апорай на дыханне, то не павінна быць ніякіх праблем. Але лепш параіцца са спецыялістам, напрыклад, фанапедам-вакалістам ці хаця б проста педагогам-вакалістам, які зможа з вамі пазаймацца і канкрэтна ўказаць, ёсць у вас праблемы ў тэхніцы ці няма.

***— Я чула, што для голасу карысны гранатавы сок. Я не магу трачу грошы?***

— Не дарма, бо гранатавы сок карысны ўвогуле, для гемаглабіну ў тым ліку. Але сцвярджаць, што ён ставіць голас, я не магу. Ён павышае гемаглабін, а гэта кісларод — харчаванне ўсіх нашых тканін, а не толькі галасавога апарату. А ўвогуле кіслыя сокі не рэкамендуюцца, я б раіла яго разбаўляць кіпячонай вадой.

***☎— Вольга, Брэст. Я б хацела трапіць на прыём да фаніятра. Па якім адрасе ў Мінску знаходзіцца цэнтр? Ці трэба загадзя запісвацца і ці патрэбна накіраванне ад урача?***

— Цэнтр знаходзіцца ў Мінску па вуліцы Сухая, 8. Прыём ажыццяўляецца па запісе і па накіраванні ЛОР-урача паліклінікі па месцы жыхарства. Звярнуцца можна і без накіравання — тады гэта будзе платная кансультацыя. Да нас накіроўваюць пераважна ЛОР-урачы, але, ўлічваючы дэфіцыт вузкіх спецыялістаў на месцах, мы не адмаўляем, калі накіроўваюць эндакрынолагі, неўрапатолагі, пульманолагі, тэрапеўты, педыятры.

***— Як захаваць моцны ад прыроды голас, калі спяваеш?***

— Спевам, як любому рамяству, трэба вучыцца, прычым вучыцца ўсё жыццё. Павінна быць школа, поўная вакальная тэхніка. Пець пажадана пад кантролем педагога, які час ад часу правярае, ці правільна вы ўсё робіце. Так паводзяць сябе прафесійныя артысты — у іх ёсць педагог, які з ім займаецца. Пець неабходна ў сваім дыяпазоне. Кожны чалавек ад нараджэння мае пэўны дыяпазон — гэта індывідуальна, як рост, вага, колер вачэй. Нельга ні ў якім выпадку імітаваць голас іншага спевака. Асабліва гэта тычыцца дзяцей, якія любяць спяваць «пад папулярных выканаўцаў». Гэта можа нашкодзіць галасавым звязкам. Караоке — гэта ўвогуле біч, аматары такіх спеваў сябе не чуюць, часам вельмі моцна зрываюць галасы. А тым, хто займаецца сур'ёзна, трэба за тым, каб спяваць у сваім дыяпазоне, зручны рэпертуар, які падабаецца, не стамляючыся ад вобраза, ад выкканання. Пасля не павінна быць ніякіх непрыемных адчуванняў — толькі пачуццё добра выкананай справы. Пасля спеваў, як і пасля любой іншай галасавой нагрузкі, рэкамендуецца хвілін 30 не выходзіць на вуліцу, асабліва ў холад і сырасць, даць галасавым звязкам адпачыць, насіць шалік, не крычаць, гучна не смяяцца на вуліцы. Выключыць ежу, якая раздражняе слізістую, — семкі, сухое печыва, шыпучыя газіраваныя напоі, вельмі вострую і кіслую ежу, абмяжаваць марынады. Галасавыя звязкі неабходна паберагчы асабліва тады, калі наперадзе вялікае адказнае выступленне.

***— Чай з мёдам карысны для спеваў, ці той жа час быццам бы мёд негатыўна ўплывае на голас...***

— Часта назіраецца індывідуальная непераноснасць мёду, і нярэдка мёд у чыстым выглядзе раздражняе слізістую. Але калі выпіць чай з мёдам ці растварыць мёд у кіпячонай вадзе — шкоды не будзе.

***— Ад чаю з мятай голас лепш гучыць?***

— Гэта стэрэатып, які існуе і ў адносінах яек, каньяку. Голас — нервова-псіхічны акт. Ад таго, як мы настроены, у многім будзе залежаць наша гучанне. Не толькі ад фізіялагічнага стану галасавых звязак, але і ад таго, што мы ў свой голас укладваем, залежыць вынік. Калі верыце, што дапамагае чай з мятай і яйкі, — калі ласка. Праўда, перад спевамі не трэба эксперыментаваць: калі піць чай, то не гарачы, а тэмпературы цела. У перапынку можна дазволіць сабе пару глыткоў, каб зняць напружанне галасавога апарату. Але гарачае і халоднае ні ў якім разе нельга.

***— Ці можна спяваць на фоне фізічнай нагрузкі? Я прыходжу дадому стомленая пасля працы і ў 9-10 гадзін вечара рэпецірую?***

— Калі гэта атрымліваецца праз сілу, то лепш не трэба. Калі ў канцы дня вы адчуваеце стому, гэта стома не гартані, а мышачнай і нервовай сістэм арганізма. Тады вам больш патрэбны спакой, цішыня, ціхая музыка і мяккі свет. Звычайна ў 9-10 гадзін нашаму арганізму патрэбныя сон ці падрыхтоўка да сну, а не спевы, — такія ў нас біярытмы. З іншага боку, змена віду працы — гэта ж таксама адпачынак. Калі спевы — гэта хобі, то яно не павінна шкодзіць ні асноўнай працы, ні здароўю, а прыносіць задавальненне.

**Прамую лінію правялі Вольга ШАЎКО і Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## Гарбузова-сырны пірог з капустай і яйкам

**Вельмі смачны хатні восеньскі пірог з мяккага дражджавога цеста на аснове гарбузовага пюрэ і сыру.**



***Спатрэбіцца:** гарбузовае пюрэ — 300-400 г, малако — 100 г, смятана — 3-4 ст. л., дрожджы сухія — пачак (11 г), яйкі (2 шт. — у цеста, 3 шт. — у начынку, 1 шт. — для змазвання пірага) — 6 шт., сода — 1/4 ч. л., мука — 5-6 шклянак, капуста — 1 невялікі качан, морква (невялікая) — 1 шт., цыбуля рэпчатая — 1 шт., часнок — 2 зуб., сыр (надзёрты на тарцы) — 3-4 ст. л., зяленіва сушанае, алей, чарнасліў (без костачак) — 3-4 шт., кунжут (белы, для ўпрыгожвання).*

Гарбуз запячы ў духоўцы да поўнай гатоўнасці, даць крыху астыць, зрабіць пюрэ. У цёплае пюрэ дадаць паўшклянкі малака, 3 ст. л. смятаны, чвэрць чайнай лыжкі соды, старанна перамяшаць. Дадаць сухія дрожджы, добра перамяшаць. Дадаць 2 яйкі, соль, ізноў добра перамяшаць. Паставіць у цёплае месца. Калі праз 5—10 хвілін цеста пачне вельмі інтэнсіўна падыходзіць, пачынаем мясіць, дадаючы муку, пакуль цеста не перастане ліпнуць да рук. Сфармаваць шар, накрыць і паставіць у цёплае месца для пад'ёму. Прычым верхнюю частку шара трэба змазаць алеем.

Рыхтуем начынку: здрабняем часнок, рэжам цыбулю, надзіраем моркву, злёгку абсмажваем на алеі. Вельмі тонка шаткуем капусту. Дадаём яе да гароднін, прысольваем, тушым да гатоўнасці, перыядычна памешваючы. Надзіраем сыр на дробнай тарцы, адварваем 3 яйкі ўкрутую.

Праз 40 хвілін цеста ўжо павінна добра падысці. Выкладваем цеста на рабочую паверхню, пасыпаную мукой, дадаём дзёрты сыр, сухое зяленіва і вымешваем. Ізноў пакідаем цеста для таго, каб яно паднялося (папярэдне змазаўшы верх алеем).

У гатовую капусту дадаём нарэзаны чарнасліў, сухое зяленіва, калі трэба — солім.

Пасля таго, як цеста падыдзе ізноў, дзелім яго на 2 часткі (адна павінна быць крыху большай за другую).

Большую частку раскатваем і пераносім на змазаную алеем бляху, так, каб бакі крыху звісалі. Зверху на цеста кладзём капусту, на яе раскладваем нарэзаныя яйкі, зваранымі загадзя.



Раскатваем другую частку цеста, накрываем капусту, зашчыпваем бакі, упрыгожваем па жаданні, даём пірагу падысці 10—15 хвілін, змазваем разбоўтаным яйкам, пасыпаем кунжутам, адпраўляем у разагрэтую духоўку (дзесьці 180 градусаў) да зарумянівання (хвілін на 30).

-2790-

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Дэкаратыўныя «латкі»

**На жаль, адзенне на дзецях проста «гарыць»! Не паспееш купіць новыя джынсы, а яны ўжо з дзіркамі. І латкі ставіць брыдка, і так насіць нельга.**

Пры дапамозе фантазіі, шпілек і пацерак вы можаце ператварыць дзірку на джынсавым адзенні ў стыльны дэкор.

Для гэтага акуратна апрацуйце разарванае месца, выцягніце трохі гарызантальных нітак, каб зрабіць махры. Затым здыміце са шпілек галоўкі, наніжыце па некалькі пацерак на кожную і зноў замацуйце галоўкі шпілек пласкагубцамі. Цяпер трэба «зашпіліць» дзіркі гэтымі прыгожымі шпількамі. Каб эфект быў поўным, вы можаце зрабіць яшчэ 2-3 надрэзы і таксама змацаваць іх дэкаратыўнымі шпількамі.

Вашаму дзіцяці напэўна спадабаецца такі варыянт значна больш, чым простая цыроўка або латка.

КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

## Холад дапаможа

**Ачысціць адзенне ад жуйкі.** Змясціце адзенне ў маразілку на некалькі гадзін, потым саскрабіце нажом жуйку, якая прыліпла, і замыйце пляму. Ад жуйкі не застанецца і следу. Гэтым жа спосабам можна чысціць адзенне ад воску.

**Падоўжыць жыццё жаночым панчохам.** Новыя панчохі і калготкі можна змясціць на некалькі гадзін у маразільнік, тады яны будуць насіцца даўжэй і будуць больш устойлівыя да зацяжак.



**Пазбавіцца ад кругоў і мяшкоў пад вачамі.** Для гэтага захоўвайце ў маразілцы дзве чайныя лыжкі. Пры ўзнікненні мяшкоў пад вачамі прыкладзіце да іх ледзяныя лыжкі на паўхвіліны. Гэта выкліча звужэнне сасудаў і адток вадкасці, і прыпухласць сыдзе.

**Павялічыць эфектыўнасць і тэрмін захоўвання касметыкі.** Трымайце касметыку ў халадзільніку (але не ў маразільнай камеры!). Асабліва гэта датычыцца крэмаў, тонікаў, ласьёнаў, масак і скрабаў. Нізкая тэмпература падоўжыць карысныя ўласцівасці самога крэму і павялічыць тэрмін яго захоўвання на паратройку месяцаў. Калі вашай касметыкай карыстаўся іншы чалавек або вы фарбавалі вусны памадай пры наяўнасці герпесных высыпанняў, то пазбавіцца ад магчымай заразы можна, паклаўшы касметыку, у тым ліку і дэкаратыўную, у маразільнік на 2-3 гадзіны.

**Разнасіць новы абутак.** Укладзіце ў яго трывалыя поліэтыленавыя пакеты напоўненыя вадой, і замарозьце ўсё ў маразільніку. Як вядома, вада пры замярзанні пашыраецца, з 10 аб'ёмных частак вады атрымліваецца 11 частак лёду. Так што ёсць шанц, што абутак павялічыцца на адзін, а можа, і на два памеры.

ПАРАДЫ МАЙСТРА

## Абарона для слупоў

Слупы і бэлькі, ужо закапаныя ў зямлю, можна напоўніць воданепранікальным саставам. Для гэтага ў частцы слупа, які знаходзіцца над зямлёй, свідруецца адтуліна дыяметрам прыблізна 1 см (прычым свідруецца наўскос зверху ўніз, да сярэдзіны слупа або бэлькі), якая запаўняецца карбалінеумам (або аналагічным саставам) датуль, пакуль слуп не ўбярэ ўсё ў сябе (на працягу аднаго-двух дзён). Пасля гэтага ў адтуліну забіваецца драўляны калок, лішняя частка якога спілоўваецца.

-2791-

## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**АЎТОРАК, 4 кастрычніка**

Ніякіх актыўных дзеянняў! Можна займацца не самымі важнымі справамі. Добры дзень для навядзення парадку, уборкі.

**СЕРАДА, 5 кастрычніка**

Рабіце пакупкі, пачынайце лячэнне, заводзьце новыя знаёмствы. А вось навядзенне хворых варта адкласці, інакш ёсць шанц атрымаць іх хваробы.

**ЧАЦВЕР, 6 кастрычніка**

Сёння варта адмовіцца ад працы на зямлі. Лепш правядзіце час за добрай кнігай. Можна заняцца навядзеннем парадку ў асабістых паперах і архіве.

**ПЯТНІЦА, 7 кастрычніка**

Займіцеся будаўніцтвам або рамонтам. Спрыяльна і развядзенне жывёлы. Добры дзень для заключэння дамоў па куплі нерухомасці.

**СУБОТА, 8 кастрычніка**

Дзень падыходзіць для таго, каб заняцца сваёй знешнасцю. Эфект ад касметычных працэдур і свежая стрыжка-афарбоўка будуць цешыць працяглы час.

# Цяпер будуць рыхтаваць спецыялістаў для дзяржаўна-прыватнага партнёрства

Пра новую спецыяльнасць — «Кіраванне інвестыцыйнымі праектамі ў дзяржаўна-прыватным партнёрстве» — па праграме вышэйшай адукацыі II ступені з паглыбленай падрыхтоўкай спецыяліста расказвае **Ірына НОВІКАВА, загадчыца кафедры эканамічнай тэорыі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук, прафесар.**

**— Што такое дзяржаўна-прыватнае партнёрства?**

— Дзяржаўнае прыватнае партнёрства — гэта адносна новы тэрмін. Па такой бізнэс-мадэлі Захад працуе з 90-х гадоў. Галоўная ідэя ў тым, што дзяржава саступае прыватнаму бізнэсу нейкія свае нішы. Прынята, што дзяржава павінна будаваць дарогі, вакзалы, бальніцы, школы, рэстаўраваць музеі. У бюджэце грошай на гэта можа не хапаць. Тады разам бізнэс і дзяржава будуюць аб'екты, палепшаюць інфраструктуру і гэтак далей. Гэта неабходна, бо дзяржава, як правіла, дрэнны менеджар. Мы ж разумеем, што дзяржава — гэта чыноўнік. Каб зрабіць менеджмент больш эфектыўным, трэба запрасіць у гэтыя традыцыйна дзяржаўныя сферы прыватніка. Ён, акрамя таго, што прыносіць грошы, кіруе фінансавымі патокамі (не толькі сваімі, але і дзяржаўнай часткай).

**— А гэта магчыма толькі ў сферы будаўніцтва чаго-небудзь?**

— Зусім не абавязкова. Можна проста атрымаць частку правоў на нейкае дзяржаўнае прадпрыемства. Прыклад з жыцця: у адным з нашых раённых цэнтраў існуе дзяржаўнае прадпрыемства, якое здало ў арэнду меншаму прыватнаму прадпрыемству свае плошчы. Прыватнік выпускае практычна тую ж прадукцыю. Тым не менш малое прадпрыемства квітнее, а вялікае развіваецца ўсё горш і горш. І прадстаўнік прыватнага прадпрыемства кажа: «Можаце мне не прадаваць яго. Тым больш, у мяне грошай няма, каб яго купіць. Але я магу вывесці вас са стану крызісу». Гэта называецца «траставае кіраванне» (кіраванне, заснаванае на даверы): дзяржава застаецца ўласнікам, але на некалькі гадоў кіраванне аддаюць прыватніку. Нейкі час ён атрымлівае частку прыбытку. Пры гэтым захоўваюцца працоўныя месцы, цана тавару ці паслугі зніжаецца.

**— Якія ўмовы ёсць для развіцця такой бізнэс-мадэлі ў Беларусі?**

— Як вы ведаеце, у канцы снежня 2010 года была прынята Дырэктыва № 4, у восьмым пункце якой гаворыцца пра тое, што нам неабходна развіваць дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Але што гэта такое, пакуль слаба разумеюць нават бізнэсмены. Аднак на 2012 год запланавана прыняцце закона аб дзяржаўным прыватным партнёрстве (праект ужо распрацаваны). А значыць, будуць створаны ўсе ўмовы для развіцця гэтай галіны і прыцягваць інвестараў будзе прасцей.

**— Значыць, спецыялісты ў сферы дзяржаўна-прыватнага партнёрства будуць запатрабаваны?**

— Безумоўна. І ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь разумеюць, што трэба пачаць падрыхтоўку такіх спецыялістаў. У нас ужо ёсць кароткія тыднёвыя курсы, але за 40 гадзін многаму не навучыш.

**— Якія веды павінны мець тыя, хто хоча пайсці на новую спецыяльнасць?**

— Няма абмежаванняў па адукацыю, таму што партнёрства можа быць у самых розных сферах (нават музейная справа). Але эканоміку трэба ведаць хоць бы на элементарным узроўні. А эканамічную тэорыю вывучаюць усе. Таму гутарка будзе праходзіць менавіта па гэтым прадмеце.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# НЕ БУДЗЕ РОСТУ ЭКСПАРТУ БЕЗ ДОБРЫХ БРЭНДАЎ

**Як павялічыць экспарт беларускіх харчовых тавараў? Хто вінаваты ў тым, што многія беларускія прадукты дрэнна рэалізуюцца на знешнім рынку? Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на форуме «Экспарт беларускіх харчовых прадуктаў» у Беларускай гандлёва-прамысловай палаце.**

Цэнтр стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы» арганізаваў форум для таго, каб непасрэдна ад вытворцаў і маркетолагаў пачуць, якія ёсць зараз праблемы з прасоўваннем беларускай харчовай прадукцыі на замежныя рынкі. Асабліва акцэнт быў зроблены на расійскім рынку, які, па словах **Зінаіды Ільіной, загадчыцы аддзела рынку Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі,** «быў і будзе для нас адным з асноўных».

«Сярод краін СНД толькі Беларусь змагла забяспечыць сваю харчовую бяспеку, — заявіла яна. — Дарэчы, Беларусь ніколі не рабіла акцэнт на ўнутраным рынку. Харчовая бяспека, якая замкнёна ўнутры краіны, не можа быць забяспечана». Наша краіна сёння забяспечана харчам, па словах эксперта, не менш чым на 150 працэнтаў. Але гэта не значыць, што мы будзем есці толькі сваю прадукцыю. Імпарт усё роўна патрэбны. «15-17 працэнтаў імпарту неабходны. Асабліва для падтрымання канкурэнцыі», — лічыць Зінаіда Ільіна.

Нягледзячы на добрыя паказчыкі харчовай бяспекі, у Беларусі з прыбыткам працуе толькі кожнае трэцяе сельскагаспадарчае прадпрыемства. Зінаіда Ільіна лічыць, што гэтага мала. Зараз такі час, што грошы неабходна жорстка эканоміць. «Цяпер грошы будуць давацца толькі тым прадпрыемствам, якія працуюць эфектыўна», — сказала эксперт. Аднак ва ўсёй гэтай сітуацыі ёсць адзін маленькі нюанс: працоўнасць рэнтабельна тыя, хто сам прадае сваю прадукцыю. А ці змажа кожнае прадпрыемства само займацца рэалізацыяй сваіх тавараў? Хутчэй за ўсё, не. Значыць, трэба ўтвараць такія спецыяльныя арганізацыі, якія будуць займацца продажам прадукцыі. Спробы ўжо былі. Эфекту мала. Самі вытворцы кажуць аб тым, што трэба прасоўваць тыя тавары, якія не прадаюцца, бо дылеры гатовы брацца толькі за тое, што добра ведаюць і што даўно разрэкламавана.

Атрымліваецца, што вытворцы і дылеры скідваюць адзін на аднаго функцыю рэкламавання, прасоўвання тавару на рынак, фарміравання брэнда. **Анатоль Аканцінаў, генеральны дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы»** лічыць, што пытанне менеджменту павінна прапрацоўвацца самім прадпрыемствам. «Трэба адказаць на пытанне: «А чаму штосьці не рэалізуецца?» — параіў ён прадстаўнікам прадпрыемстваў. А **расійскі эксперт Андрэй Стась (кансультант па стратэгіі маркетынгу і развіцця бізнэсу, заснавальнік і генеральны дырэктар кампаніі «Stas marketing partners»)** расказаў, што расійская таваратраводная сетка бярэ ў працу толькі прадукты з прагназуемым попытам. Гэта значыць, што без прапрацаванага брэнда на расійскім рынку няма чаго рабіць. «Бачыце, на першым месцы нават не якасць...» — канстатаваў Андрэй. Таксама ён засяродзіў увагу на тым, што і павышаць цэны на беларускія экспартныя тавары без добрых брэндаў няма сэнсу.

Акрамя брэндаў, Беларусі яшчэ патрэбна дапамога малога і сярэдняга бізнэсу. Такое меркаванне выказала Зінаіда Ільіна, здзіўляючыся таму, што мы змаглі згубіць не толькі замежны, але і ўнутраны рынак бульбы. «Па многіх напрамках лепш за ўсё можа спрацаваць малы бізнэс. Я лічу, што бульбу можа вырабляць менавіта ён», — сказала эксперт.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## Факт

### Пажар у падвале. Пацярпела сям'я

**Прыкладна ў 21.30 у пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна па вуліцы Аршанскай адбыўся пажар у падвале жылога дома. Загінуў гаспадар, грамадзянін 1966 года нараджэння, індывідуальны прадпрымальнік.**

З апёкамі першай-другой ступені (пяці працэнтаў цела) і атручэннем прадуктамі гарэння былі шпіталізаваны жонка — равесніца гаспадара, індывідуальны прадпрымальнік, і сын гаспадара, 1991 года нараджэння, студэнт трэцяга курса Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Апошні быў выратаваны работнікамі МНС. Як мяркуецца, прычынай пажару стала парушэнне правілаў эксплуатацыі газавых устройстваў і агрэгатаў (уцечка газу).

### Радыеактыўная крыніца ў металаломе

**Раніцай у Мар'інай Горцы па вуліцы Андрэеўскай на адкрытай пляцоўцы аддзела нарыхтоўкі Пухавіцкага райспажывтаварыства ў металаломе была знойдзена крыніца радыеактыўнага выпрамельвання.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Цэнтры сацыялогіі і прапаганды бяспекі МНС РБ, яна ўяўляла сабой металічную трубу даўжынёй адзін метр з дыяметрам 40 міліметраў. Праведзеныя работнікамі МНС замеры паказалі, што радыяцыйны фон складае 70 мкЗв/г (норма — 0,2 мкЗв/г, перавышэнне ў 350 разоў, пагранічнае гэта быў радый-226), прычым на адлегласці два метры фон быў у норме. Небяспека магчымага радыеактыўнага забруджвання была ліквідавана ўнітарным прадпрыемствам «Экарэс». Пацярпелых не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Укралі 99 кілаграмаў рыбы

У горадзе Новалукомль з тэрыторыі ўчастка рыбгаса, якая ахоўваецца, укралі 99 кілаграмаў рыбы агульным коштам больш як 2,6 мільёна рублёў. Нехта ночу разбіў аконнае шкло і трапіў у цэх.

Супрацоўнікі Чашніцкага раённага аддзела ўнутраных спраў устанавілі, што рыбу ўкраў 26-гадовы раней судзімы, беспрацоўны жыхар вёскі Багатыр. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРАВАВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ — У 470 ПУБЛІЧНЫХ ЦЭНТРАХ

**Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Беларусі правядзе 4 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы чарговы рэспубліканскі семінар па пытаннях доступу грамадзян да заканадаўства.**

Размова ідзе пра публічныя цэнтры прававой інфармацыі, якія з'яўляюцца пунктамі свабоднага доступу грамадзян да эталоннай прававой інфармацыі. Ужо зараз Міністэрствам культуры Беларусі і Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь створаны па ўсёй краіне 470 адпаведных цэнтраў. Яны забяспечваюць грамадзян актуальнай эталоннай прававой інфармацыяй, змешчанай у дзяржаўных інфармацыйна-прававых рэсурсах. У прыватнасці, гэта электронная копія эталоннага банка звестак прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь з інфармацыйна-пошукавай сістэмай «Эталон», афіцыйныя друкаваныя выданні прававых актаў, афіцыйнае перыядычнае выданне «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь», Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Беларусі.

Кожны ахвотны можа звярнуцца ў цэнтр прававой інфармацыі і азнаёміцца з прававымі актамі па патрэбнай тэме. Пры неабходнасці спецыяліст-бібліятэкар дапаможа ў пошуку. Падчас сёлетняга семінара плануецца абмеркаваць павышэнне эфектыўнасці функцыянавання цэнтраў у дзяржаўнай сістэме прававой інфармацыі, вызначыць стратэгіі развіцця сеткі цэнтраў у бліжэйшыя гады.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Аварыя

### Чатыры гадзіны без электрычнасці

**У нядзелю ў сталіцы ў 8.28 у выніку аварыі на паветранай лініі 110 кВ адбылося адключэнне падстанцыі Падлесная і, як вынік, усіх яе спажыўцоў.**

Падраздзяленнямі МНС Мінска былі прыняты ўсе неабходныя меры для забеспячэння электраэнергіяй тых аб'ектаў, дзе гэта было жыццёва неабходна. У прыватнасці, як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, пры дапамозе генератараў засілкавалі першую гарадскую клінічную бальніцу, дзіцячы дом № 4, халадзільныя ўстаноўкі шостай гарадской клінічнай бальніцы, дзе захоўваецца плазма крыві, рэанімацыйныя і аперацыйныя аддзяленні дзіцячага хірургічнага цэнтра, дзе ў той момант знаходзілася дзесяць дзяцей, чацвёра з якіх былі ў цяжкім стане.

Таксама падчас адключэння адбылося спыненне трох трамвайных і чатырох тралейбусных маршрутаў грамадскага транспарту, трох вадапомпавых станцый, 21 ліфта з людзьмі ў жылых дамах. У 12.42 электразабеспячэнне на падстанцыі Падлесная было адноўлена.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Березинское» (продавец)**
проводит открытый аукцион по продаже здания столовой, (инв. № 630/С-47235), об. пл. 157,6 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Молодечненский р-н, Городиловский с/с, вблизи аг. Березинское, территория промышленной зоны, уч. 1.**

**Начальная цена с НДС – 18 918 556 бел. руб.**

Площадь земельного участка – 0,0525 га.

Задаток 10% от начальной стоимости объекта перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **04.11.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.11.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 октября 2011 года проводит 15-й повторный открытый аукцион на 16-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка, (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 130 | Четырехосный вагон-самосвал (думпкар) № 55631592, 4 кат., КР-2001 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1976 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 131 | Четырехосный вагон-самосвал (думпкар) № 55632194, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1972 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 132 | Четырехосный вагон-самосвал (думпкар) № 55632343, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1972 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 133 | Четырехосный вагон-самосвал (думпкар) № 55632418, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1976 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00 **14 октября 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **11 октября 2011 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **14 октября 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

## ИП Малашенко Николай Ефимович

**извещает о проведении 1 ноября 2011 г. открытого аукциона на право заключения договора субаренды помещения, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Огаренко, д. 30**

| № лота | Вид помещения | Цель использования | Площадь объекта, м² | Начальная цена продажи евро (оплата по курсу НБРБ на дату платежа) | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Помещение № 5 | Розничная торговля | 33,2 | 597,6 | 200 000 |

Объект сдается в субаренду сроком на 11 месяцев. Размер арендной платы: 6 евро (по курсу Национального банка) за 1 м² в месяц.

К участию в аукционе допускаются только юридические лица.

**Условия продажи лотов:** Торги по каждому лоту проводятся отдельно. Каждый участник имеет право участвовать в торгах по нескольким лотам при условии регистрации и внесении платы за участие и задатка по каждому из заявленных лотов.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток на р/с 3013216720019 в Головном ф-ле по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», код 768.

**Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, 4к, 4. Начало в 14.00.**

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, Шилова, 4к, 4** по понедельникам с 11.00 до 12.00 по 31 октября 2011 г. включительно. Подача документов по почте не допускается. На аукционе побеждает лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Победитель торгов после подписания протокола о результатах аукциона обязан: в течение 5 дней подписать договор субаренды; в течение 11 месяцев (помесячно равными долями) оплатить стоимость права субаренды, сформированную в результате аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; в течение 3 дней с даты подписания протокола возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона на основании выставленного счета. Организатор торгов вправе снять лот с торгов до объявления его проданным.

**Контактные телефоны организатора аукциона: 8 029 7318318.**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітара Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

## РАШАЛЬНІК З РАГАЧОВА



Калі літаратурныя творы ствараюцца для чытачоў, музычныя — для слухачоў, дык шашачныя — для аматараў рашаць задачы, эцюды і камбінацыі на 64 і 100-клетачных дошках. Самымі моцнымі рашальнікамі былі Аляксандр Райкоў, Барыс Фарбераў і Міхаіл Апаровіч з Мінска, Мікалай Андрушчанкаў з Пінска. Зараз такім з'яўляецца Уладзімір Сапяжынскі з Рагачова, што на здымку. Ён — чэмпіён Беларусі па рашэнні шашачных сітуацый, кандыдат у майстры спорту. Бярэ ён тым, што мае дар знаходзіць у шматлікіх пазіцыях поўныя альбо прыватныя пабочныя разгалінаванні і даказваць, што некаторыя не развязваюцца. Удзельнічае і ў нашых конкурсах, перамагаў у такіх з іх, як «Пагода ў доме», амаль ва ўсіх аўтарскіх і бліцах. Спрабуе складаць і ўласныя канструкцыі. У рамках бліца-63/3 разбярыце яго задачу:



**Белыя**: a3, b2, c1, d6, e3, e7, g1, g7, дамкі e5, h6 (10). **Чорныя**: a7, b6, h2 (3). Замкнуць дамку і дзве простыя.

**НА ПРЫЗЫ КАЛЕКТЫВУ**

Конкурс «Пагода ў доме» праводзіцца ў восьмы раз. Яго лаўрэатаў чакаюць узнагароды Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Сёння прапануецца заданне № 18:

**Белыя**: a3, c1, e3, f2, f4, g3, h6 (7). **Чорныя**: b4, c5, d4, d6, e5, e7, f8, g5, g7 (9). Перамога белых.

**АДЗІН СКЛАДАЛЬНІК**

Усе кампазіцыі аўтарскага конкурсу-14 належаць міжнароднаму майстру Віктару Шульгу (Мінск), які для перамоцжаў падрыхтаваў сюрпрызы. Разгледзьце чарговае заданне:



№ 21. **Белыя**: 15, 18, 19, 21, 23, 24, 25, 29, 34, 39, 41, 44, 49 (13). **Чорныя**: 4, 7, 8, 10, 11, 12, 16, 27, 28, 32, 33, 36, 38 (13). Перавага белых.

***

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: ***220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».***

**РАШЭННІ**

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**«Пагода ў доме»-8/12** (М. Грушэўскі): f6, b4, c5, a3, e7, f2 (g3, d4A) g5 (c3) c1x. A(f4) f2x.

**Бліц-62/3** (В. Шульга): 13, 3 (48A) 39 (34) 17-12 (18B) 3-17, 36, 15 (37), 47x. A(14) 25, 39, 36, 15x. B(14) 36(18C) 15, 42 (31, 38) 48x. C(27) 4 (23) 15 (37D) 10x. D(28) 42x.

**Аўтарскі-13/23** (Л. Вітошкін): d4-c3 (f4A) g5, de3, c1-d2, g3, ab4, b2x. A(h4) c3-b4, g7, g5, h2, h6, g7, e1, h6, d4, g5, eg3, e1x.

КІРМАШ штотыднёвы рэкламны выпуск № 39 (701)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ А/м «Форд-Эскорт» 1994 г.в., у добрым стане за бел. рублі.
Тэл.: 8 01594 22 494, 8 029 363 40 95.

❒ Рухавік ад а/м «Пежо-406», 2,2, бензін, 2002 г.в.
Тэл. 8 029 585 37 00 у Гродне.

❒ Дом з усімі выгодамі, г/п, гараж, лазня, у Бягомлі, або абмяняю на 1-пакаёвую кватэру ў Мінску.
Тэл. 8 033 317 39 26.

❒ Зямельны ўчастак, в. Рыбцы Пухавіцкага раёна, 15 сотак, 500 м ад электрычкі.
Тэл. 8 017 287 39 27.

❒ Запчасткі для трактароў Т-40 і Т-25 (генератар, паршнявая, пярэдні мост, колы і інш.).
Тэл.: 8 01719 31 929, 8 017 270 98 48.

❒ 2-пакаёвая кватэра ў Мінску, агульная плошча 40 кв. м, 5-павярховы дом, Зялёны Луг.
Тэл.: 8 029 313 36 93, 318 95 43.

❒ Трактар ЮМЗ + запчасткі.
Тэл. 8 029 613 47 19.

❒ 3-пакаёвая кватэра ў г. Бабруйску, плошча 71 кв. м, цагляны дом.
Тэл. 134 55 47 (Vel).

❒ Старадаўні ручны млынок (жорны), в. Зарубы Дубровенскі раён Віцебскай вобласці.
Тэл.: 8 029 324 21 69, 8 0213 73 61 64.

❒ Стартар СТ 230 УАЗ, карбюратар УАЗ, КПП УАЗ, РКПП УАЗ і інш. абсталяванне.
Тэл. 8 029 611 03 74.

❒ Касілка (Польшча) новая, даўжыня 2 м, вага 300 кг.
Тэл. 2920614 (МТС).

**РОЗНАЕ**

❒ 12 верасня ўкрадзены конь, чырвоны, хвост і грыва чорныя, на лбе светлая пляма. Будзе ўзнагарода.
Тэл.: 8 029 810 10 82, 8 01771 64 684.

❒ Тэрмінова патрабуюцца прафесійныя цесляры зрабіць тэрасу і іншыя работы каля Мінска.
Тэл. 8 029 652 78 84 Velcom.

ЗВЯЗДА **КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя________ №______________ Выдадзены ______________________

Подпіс ____________________ Дата ___________

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

*3 ноября 2011 г.* **проводит открытый** *аукцион* **по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000234 | 0,1526 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 190 970 | 22 000 000 | 2 200 000 |
| 2 | г. Заславль, ул. Багряная, 14 | 623650100001004434 | 0,1024 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 053 020 | 61 000 000 | 6 100 000 |
| 3 | г. Заславль, ул. Багряная, 16 | 623650100001004433 | 0,1031 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 048 810 | 62 000 000 | 6 200 000 |
| 4 | г. Заславль, ул. Багряная, 17 | 623650100001004439 | 0,1062 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 048 810 | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 5 | г. Заславль, ул. Багряная, 19 | 623650100001004436 | 0,1077 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 053 020 | 64 000 000 | 6 400 000 |
| 6 | г. Заславль, ул. Багряная, участок № 6 | 623650100001004435 | 0,1026 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 158 770 | 61 000 000 | 6 100 000 |
| 7 | г. Заславль, ул. Багряная, участок № 10 | 623650100001004438 | 0,1018 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 163 170 | 61 000 000 | 6 100 000 |
| 8 | г. Заславль, ул. Береговая, 6 | 623650100001004437 | 0,1177 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 272 000 | 68 000 000 | 6 800 000 |
| 9 | г. Заславль, ул. Анусинская, 68а | 623650100001004432 | 0,1280 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 251 180 | 121 000 000 | 12 100 000 |
| 10 | Новодворский с/с, аг. Гатово, участок № 50 | 623684301601000563 | 0,1501 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 506 546 | 44 000 000 | 4 400 000 |
| 11 | Новодворский с/с, аг. Гатово, участок № 51 | 623684301601000564 | 0,1501 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 506 546 | 44 000 000 | 4 400 000 |
| 12 | Новодворский с/с, аг. Гатово, участок № 52 | 623684301601000565 | 0,1544 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 506 546 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 13 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 7 | 623685505101000366 | 0,1456 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 214 870 | 44 000 000 | 4 400 000 |
| 14 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 8 | 623685505101000360 | 0,1460 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 214 870 | 44 000 000 | 4 400 000 |
| 15 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000140 | 0,1301 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 16 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000169 | 0,1731 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 17 | Петришковский с/с, аг. Петришки | 623685707601000121 | 0,1554 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 42 000 000 | 4 200 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **03.11.2011 г. в 9.30.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **28.10.2011 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 2–9 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На Лоты 10–12 перечисляется на расчетный счет № 3600621100123 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600230217, код платежа – 04901.

На Лоты 13–14 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На Лоты 15–17 перечисляется на расчетный счет № 3600621130151 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

## Здарэнні

### Студэнтку БДУІР насмерць збілі на пешаходным пераходзе

**Студэнтку 1 курса ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі на пешаходным пераходзе збіў аўтамабіль БМВ. 17-гадовыя дзяўчына памерла на месцы.**

Здарэнне адбылося 27 верасня ў 22 гадзіны 30 хвілін на вуліцы Сурганава (побач з гандлёвым домам «Рыга») у Мінску. 22-гадовы малады чалавек на аўтамабілі БМВ-520 збіў дзяўчыну, якая пераходзіла вуліцу на чырвоны сігнал святлафора. Як растлумачыла старшы інспектар па АіП АДАІ Савецкага раёна Марыя Дзьякава, студэнтка пачала пераходзіць дарогу на зялёны сігнал, але не паспявала і заканчвала на чырвоны. Машыны, якія чакалі зялёны сігнал, прапусцілі яе, а кіроўца БМВ занадта позна яе заўважыў, рэзка затармазіў, але пазбегнуць наезду не ўдалося. Удар быў такой сілы, што з пацярпелай зляцеў абутак.

**Алена КРАВЕЦ.**

### Загінуў у пошуку... спіртнога

**62-гадовы жыхар абласнога цэнтра атрымаў смяротныя траўмы, спрабуючы са свайёй кватэры на трэцім паверсе выбрацца на вуліцу, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Мужчына любіў выпіць і, згодна з папярэдняй інфармацыяй, раніцай спускаўся на вуліцу па звязаных прасцінах, каб набыць спіртное. Нездарма да гэтага ён атрымаў пенсію, і жонка, ведаючы, што муж можа паддацца алкагальнай спакусе, вырашыла абмежаваць яго рух на час свайго знаходжання ў сваякоў. Для гэтага яна зачыніла дзверы і не пакінула ключ. Тады пенсіянер пайшоў, так бы мовіць, па-банку: звязаўшы некалькі прасцін і навалачку, ён палез уніз, але не ўтрымаўся. Мужчына памёр на месцы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### Тралейбус наляцеў на маршрутку

На скрыжаванні вуліц Арлоўскай і Гаўрылава ў Брэсце тралейбус пратараніў маршрутнае таксі. Ад удару аўтамашына «Газель» атрымала сур'ёзныя пашкоджанні. Двaіх пасажыраў маршрутнага таксі прыйшлося шпіталізаваць. У тралейбусе ніхто не пацярпеў. Паводле папярэдняй версіі, тралейбус рухаўся на забаранялны сігнал святлафора.

**Яна СВЕТАВА.**

